НАШЫ СЛАВУТЫЯ ЗЕМЛЯКІ

Андрэй Болатаў
Генадзь Рыдзеўскі

АХВЯРУЮЧЫ СЯБЕ БАЦЬКАЎШЧЫНЕ



НАШЫ
СЛАВУТЫЯ
ЗЕМЛЯКІ

Серыя акадэмічная. Заснаваная ў 1988 годзе



Андрэй Болатаў
Генадзь Рыдзеўскі

АХВЯРУЮЧЫ СЯБЕ БАЦЬКАЎШЧЫНЕ

Аркадзь Смоліч

МІНСК
«ТЭХНАЛОГІЯ»
1999

ББК 26.8 (4Бел)
Б79
УДК 914.76 (092)+929 Смоліч

Галоўны рэдактар серыі
Зьміцер Санько

Рэцэнзенты:
Валер Аношка, доктар геаграфічных навук,
Анатоль Сідарэвіч, Людміла Хрышчановіч,
кандыдат філалагічных навук

На франтыспісе – фота А.Смоліча. Менск, 1918.

Болатаў А., Рыдзеўскі Г.

Б79 Ахвяруючы сябе Бацькаўшчыне: Аркадзь Смоліч. — Мн.: Тэхналогія, 1999. — 61 с., [9] арк. іл.; партрэт. — (Нашы славутыя землякі).

ISBN 985-6234-55-7

Чарговае выданне серыі распавядае пра цікавы і трагічны жыццёвы шлях Аркадзя Смоліча (1891—1938), таленавітага беларускага вучонага-географа, што стаяў ля вытокаў геаграфіі Бацькаўшчыны, вядомага дзеяча беларускага Адраджэння, міністра першага беларускага ўрада, аднаго з арганізатараў айчыннай навукі.

Для шырокага кола чытачоў.

ББК 26.8 (4Бел)

© А. Болатаў, Г. Рыдзеўскі, 1999
© Макетаванне. Мастацкае афармленне."Тэхналогія", 1999

ISBN 985-6234-55-7

ПРАДМОВА

Да нядаўняга часу імя Аркадзя Смоліча немагчыма было сустрэць у біяграфічных даведніках, энцыклапедыях. Яшчэ ў сакавіку 1988 года пра яго мы ведалі толькі два факты: па-першае, ён выдатны вучоны, узнагароджаны Геаграфічным таварыствам Расеі залатым медалём, па-другое, рэпрэсаваны за "ўдзел" у міфічным "Саюзе вызвалення Беларусі". Чулі, што ён напісаў бліскучыя навуковыя працы, але пазнаёміцца з імі было нельга, бо яны былі або знішчаныя, або замкнёныя ў спецыяльных сховішчах. "Дасведчаныя" людзі расказвалі пра яго неверагоднае: адны гаварылі, нібыта ён памёр у вар'яцкім доме, іншыя — што збег з лагера, ды не куды-небудзь, а за мяжу і быццам дажыў ледзь не да нашага часу.

Як жа склаўся лёс гэтага незвычайнага чалавека, таленавітага вучонага-географа? Каб знайсці адказ на гэтае пытанне, мы сустракаліся з многімі навукоўцамі, журналістамі, пісьменнікамі. Усюды спрабавалі адшукаць хоць нейкія звесткі з ягонай біяграфіі, працавалі ў архівах Менска, Санкт-Пецярбурга, сібірскага горада Ішыма. У выніку набралася шмат матэрыялу, які пакладзены ў аснову гэтай кнігі.

Аркадзь Смоліч быў рознабаковым вучоным, перакладнікам навуковых працаў сваіх калег, арганізатарам і папулярызатарам навукі. Як і кожны чалавек, ён нарадзіўся дзеля шчасця. Ніколі не лічыў сябе палітыкам, аднак не мог заставацца ўбаку ад грамадскага жыцця, марыў пра лепшае ўладкаванне сваёй краіны, пра шчаслівейшы лёс свайго народа.

Акрамя гэтага, быў годным і клапатлівым мужам і бацькам. Усё жыццё заставаўся чалавекам апантаным, імкнуўся да ведаў, марыў спазнаць сваю родную старонку на ўсіх яе абшарах і зрабіць так,

каб Беларусь перастала быць краем, невядомым самым беларусам.

Пра вучонага, грамадскага дзеяча і проста чалавека, імя якога вяртаецца ў навуку, гісторыю і свядомасць, гэтая кніга. Напачатку мы збіраліся назваць яе "Першы прафесар геаграфіі", бо Аркадзь Смоліч першы ў Беларусі атрымаў гэтую высокую навуковую годнасць і стаяў ля вытокаў сучаснай беларускай геаграфіі. Галоўным прадметам вывучэння для Аркадзя Смоліча былі прырода і грамадства роднай Беларусі ў іх непарыўнай сувязі і ўзаемадзеянні. Гэтым ён адрозніваецца ад бальшыні сваіх славутых папярэднікаў: Ігната Дамейкі і Івана Чэрскага, Бенедыкта Дыбоўскага і Андрэя Вількіцкага, а таксама дзесяткаў іншых вядомых даследнікаў — народзінцаў Беларусі, якія аддалі свой талент, здольнасці і нават жыццё вывучэнню далёкіх і блізкіх краінаў па-за межамі Бацькаўшчыны.

Аўтары выказваюць шчырую падзяку ўсім, хто дапамагаў у стварэнні гэтай кнігі, хто ўзяў на сябе працу па яе рэцэнзаванні, і асабіста дзвюм дочкам Аркадзя Смоліча — Ганне і Марыі Смоліч, якія велікадушна дазволілі пакарыстацца матэрыяламі сямейнага архіва.

ПОШУКІ ЖЫЦЦЁВАГА ШЛЯХУ

Звесткі з метрычнай кнігі ✻ Па бацькавай сцежцы ✻ З духоўнай семінарыі — у Кіеўскую палітэхніку ✻ Інстытут у Пулавах. Жыццё студэнта ✻ Далучэнне да Грамады ✻ Сядзенне ў Саламерычах ✻ Нялёгкі шлях у навуку

У шматлікіх аўтабіяграфіях, напісаных Аркадзем Смолічам пры ўладкаванні на працу і для органаў НКВД у 30-х гадах, сустракаюцца супярэчлівыя звесткі пра ягонае сацыяльнае паходжанне. Часцей за ўсё ён пісаў, што нарадзіўся ў сям'і псаломшчыка. Але гэта не адпавядае рэчаіснасці. Відаць, у 20—30-х гадах у Смоліча былі важкія падставы ўтойваць сваё сацыяльнае паходжанне, каб наблізіць сябе да класа-гегемона.

Узнікаюць пытанні і пры вызначэнні даты яго нараджэння. У "Беларускім календары" на 1991 год нататка пра юбілей Аркадзя Смоліча даецца пад датай 16 сакавіка. Аднак і гэта не адпавядае сапраўднасці.

У метрычнай кнізе Бацэвіцкай царквы Бабруйскага павета Мінскай губерні за 1891 год пад № 55 зроблены наступны запіс: "Тысяча васемсот дзевяноста першага года, верасня семнаццатага радзіўся, а дваццаць шостага хрышчаны Аркадзь; ягоныя бацькі: дыякан Бацэвіцкай царквы Антон Аляксееў Смоліч і законная яго жонка Ганна Андрэева, абое праваслаўнага вызнання; хроснымі бацькамі былі: святар Чыркавіцкай царквы Міхаіл Андрэеў Самайловіч і дачка святара Бацэвіцкай царквы Вольга Аляксеева Смоліч, дзяўчына, хрысціў святар Аляксей Смоліч з дыяканам Антонам Смолічам".

Звесткі метрычнай кнігі не пакідаюць сумневу ні ў даце, ні ў паходжанні Смоліча. Увесь ягоны род — і дзед, і бацька — святары, а сяло Бацэвічы стаіць і цяпер. Гэта адзін з буйных населеных пунктаў сучаснага Клічаўскага раёна Магілеўскай вобласці. Размешчана яно на ціхай і маленькай рачулцы Ольса, левым прытоку Бярэзіны. На месцы Бацэвіцкай царквы, зруйнаванай у 30-х гадах, знаходзіцца зараз аўтобусны прыпынак.

Паводле новага стылю Смоліч нарадзіўся 29 верасня, але дзень нараджэння ён заўсёды адзначаў не 29 верасня, а 30-га. Да такой памылкі спрычынілася няправільнае вылічэнне даты пры пераходзе ад старога каляндарнага стылю да новага, калі гаворка ідзе, прынамсі, пра XIX ст. У гэтым разе трэба дадаць 12 дзён, а не 13, як у XX ст.*

Навошта было Смолічу называць свайго бацьку псаломшчыкам, калі ён быў дыяканам? Адгадка тут нескладаная. Псаломшчыка, званара або звычайнага вартаўніка далучаюць да катэгорыі царкоўных служкаў. Яны, як правіла, не мелі духоўнай адукацыі, а проста працавалі пры царкве. Дыякан — гэта святаслужнік, які дапамагае святару пры адпраўленні таемстваў, у набажэнстве, у кіраванні справамі царквы.

Смолічы жылі ў Бацэвічах толькі першыя пяць—шэсць гадоў пасля нараджэння Аркадзя, затым ягоны бацька атрымаў новае службовае прызначэнне, і сям'я пераехала ў сяло Саламерычы Сёмкава-Гарадзецкай воласці пад Заслаўем**.

Шлях у жыццё сыну дыякана ў тыя часы быў наканаваны. Праваслаўны клір, гэтая адасобленая каста, неахвотна прапускаў у сваё асяроддзе "чужынцаў" і даваў, як правіла, сваім дзецям магчымасць прыйсці ва ўлонне царквы. Аркадзю Смолічу не выпадала выбіраць шляхі атрымання адукацыі, бо сям'я жыла сціпла, а вучоба ў духоўнай навучальнай установе для дзяцей святароў была бясплатная, ды і знаходзіліся яны на поўным дзяржаўным утрыманні.

Ад 1900 да 1905 года Аркадзь вучыўся ў Менскай духоўнай навучальні*, а пасля яе сканчэння паступіў у Менскую духоўную семінарыю. Духоўная семінарыя была заснаваная ў 1793 годзе ў Слуцку, а ў 1840 годзе пераведзеная ў Менск, дзе і атрымала свой назоў**. Семінарысты не заўсёды былі прыкладнымі вучнямі, нават тут, за тоўстымі мурамі духоўнай установы, расло незадавальненне рэакцыйным рэжымам навучання. У лютым 1905 года семінарысты разграмілі класныя памяшканні, кватэры рэктара і інспектара, знішчылі архіў***.

Перспектыва святарскай дзейнасці не задавальняла Аркадзя, і ў 1909 годзе пасля сканчэння агульнаадукацыйных класаў ён пакінуў семінарыю і паступіў па конкурсе ў Кіеўскі політэхнічны інстытут. Адтуль неўзабаве перавёўся ў Нова-Александрыйскі інстытут сельскай гаспадаркі і лесагадоўлі.

Пасля закрыцця ў 1863 годзе Горы-Горацкага земляробчага інстытута**** ў Беларусі не засталося ніводнай вышэйшай навучальнай установы. Дэфіцыт спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй востра адчуваўся ў сельскай гаспадарцы, якая пасля эканамічнага крызісу 1880—1890-х гадоў шпарка перайначвалася на капіталістычны лад, таму выбар Аркадзя быў невыпадковы.

---

* *Такія памылкі былі тады нярэдкімі. Аналагічная гісторыя здарылася, напрыклад, з першым прэзідэнтам Беларускай Акадэміі Навук Усеваладам Ігнатоўскім, расейскім пісьменнікам Іванам Буніным.*

** *Цяпер Саламарэчча Папярнянскага сельсавета Менскага раёна.*

* *Будынак захаваўся (пл. Свабоды, 13).*

** *У будынку Менскай духоўнай семінарыі цяпер знаходзіцца суворaўскае вучылішча (вул. М. Багдановіча, 29).*

*** *Шибеко З. В., Шибеко С. Ф. Минск: Страницы жизни дореволюционного города. Мн., 1990. С. 286.*

**** *Горы-Горацкі земляробчы інстытут — з 1848 года, цяпер — Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія.*

Нова-Александрыйскі інстытут сельскай гаспадаркі і лесагадоўлі знаходзіўся ў горадзе Пулавы Люблінскай губерні царства Польскага, якое ўваходзіла тады ў склад Расеі. У ім вучылася нямала народзінцаў Беларусі. Менавіта тут, у Нова-Александрыі, узнік адзін з першых студэнцкіх гурткоў па вывучэнні Бацькаўшчыны.

Інстытут разам з Пятроўскай акадэміяй* быў адной з найбуйнейшых сельскагаспадарчых навуковых устаноў у Расеі. Ён месціўся ў маёнтках, што раней належалі вядомым магнатам — князям Чартарыйскім. У 1892—1895 гадах Нова-Александрыйскі інстытут узначальваў выдатны расейскі вучоны Васілій Дакучаеў (1846—1903), заснавальнік навуковага глебазнаўства. У сценах Нова-Александрыі арганізацыйна аформілася гэтая навука, бо якраз тут у 1895 годзе адкрыта першая ў свеце кафедра глебазнаўства.

Глебазнаўства, новую навуку, ад развіцця якой залежаў дабрабыт велізарнай колькасці земляробчага насельніцтва краіны, у якасці навуковай спецыяльнасці і выбірае Аркадзь Смоліч.

Нова-Александрыя славілася не толькі сваімі прафесарамі і грунтоўнай падрыхтоўкай студэнтаў. У царскай Расеі яна мела і "нядобрую" славу як рассаднік вальнадумства і марксісцкага вучэння. Яшчэ пры Дакучаеве тут узніклі студэнцкія рэвалюцыйныя гурткі. Студэнт першага курса Аркадзь Смоліч браў актыўны ўдзел у іх працы, тут жа ў 1909 годзе ўступіў у Беларускую Сацыялістычную Грамаду. Гэта таксама не выпадкова: Аркадзь быў актыўным чытачом "Нашай Нівы", меў шчыльную сувязь з рэдакцыяй газеты, якая была штабам Грамады і нацыянальна-вызвольнага руху ў Беларусі. У "Нашай Ніве" пад рознымі псеўданімамі ён друкаваў свае першыя вершы.

* *Пятроўская сельскагаспадарчая акадэмія заснаваная ў 1865 годзе, цяпер Маскоўская сельскагаспадарчая акадэмія імя К. А. Цімірязева.*

Беларуская Сацыялістычная Грамада — адна з першых нацыянальных палітычных партый беларусаў. Яна дзейнічала з 1903 года і складалася перадусім з прадстаўнікоў новай беларускай інтэлігенцыі, у асяроддзі якой расла нацыянальная самасвядомасць, прагна ўспрымаліся ідэі народнікаў і першых марксістаў.

Навучаннем і рэвалюцыйнай дзейнасцю не абмяжоўвалася жыццё юнака ў Пулавах. Адсутнасць сродкаў існавання змушвала яго зарабляць грошы на курсах, а таксама рысавальнай і каморніцкай працай.

У лютым 1910 года Аркадзь удзельнічаў у палітычным страйку студэнтаў, за што атрымаў вымову. Пасля беспарадкаў у кастрычніку таго ж года яго як сябра страйкавага камітэта звольнілі з ліку студэнтаў і паводле пастановы Варшаўскага генерал-губернатара выслалі за межы Прывісленскага краю.

"Студэнт-няўдаліца" вяртаецца ў Саламерычы. Нейкі час ён застаецца без працы, бо на ім кляймо "нядобранадзейнага". Тут, у Саламерычах, ён робіць першыя высновы з свайго бурлівага студэнцкага жыцця, піша дзённік, думае пра будучыню. Частка нататкаў, зробленых тады, доўгімі восеньскімі вечарамі 1910 года, захавалася. Мары, спадзяванні і планы, якімі жыў тым часам юнак, сталі жыццёвай праграмай: ён канчаткова наважыўся прысвяціць сябе навуцы геаграфіі.

Цікавасць да геаграфіі ў яго невыпадковая, ён з дзяцінства зачытваўся трэцім томам "Живописной России"*, прысвечаным Беларусі, і дзевятым томам геаграфічнага апісання Расейскай імперыі "Верхнее Приднепровье и Белоруссия"**. Гэтыя навуковыя працы сталі настольнымі кнігамі Аркадзя. Ён палюбіў свой край і марыў спазнаць яго ва ўсіх праявах.

* *Живописная Россия / Под общ. ред. П. П. Семенова. Т. 1—12. Спб., 1881—1885. Т. 3. 1882.*

** *Россия: Полное географическое описание нашего отечества. Т. 9: Верхнее Приднепровье и Белоруссия. Спб., 1905.*

У нататках за 16 лістапада 1910 года можна прачытаць: "Яшчэ ў Пулавах розныя дзіцячыя ўспаміны, цяга да роднай прыроды і да ўсяго роднага нарадзілі пачуццё патрыятызму Беларускага. Яно трымалася і ўмацоўвалася беларускай літаратурай". Вось гэтае пачуццё "патрыятызму Беларускага" і легла ў аснову ўсёй ягонай далейшай дзейнасці. Ці мог ён займацца толькі мілай яго сэрцу геаграфіяй, калі бачыў пакуты сваёй Бацькаўшчыны? Не, не мог! Аркадзь не адыходзіць ад рэвалюцыйнай барацьбы, наадварот, ён мае намер аддаць усе сілы сваёй душы вывучэнню, асвеце і змаганню за лепшую долю свайго народа.

А пакуль што трэба вучыцца, набываць адукацыю, трэба працаваць... У лютым 1911 года ён уладкоўваецца на прыватную працу каморнікам у мясцовых паноў, затым тапографам у Лясным бюро Менскага таварыства сельскай гаспадаркі. Паездкі па Беларусі, па Віленскай і Гарадзенскай губернях, узбагачаюць новымі ўражаннямі, даюць першыя матэрыялы да геаграфіі роднага краю.

Увосень 1912 года Аркадзь Смоліч пастуніў на Вышэйшыя сельскагаспадарчыя курсы ў Пецярбурзе (прыватныя). Пасля іх сканчэння працаваў у хімічнай лабараторыі Лібава-Роменскай чыгункі*. Адтуль на патрабаванне жандармаў неўзабаве быў звольнены за палітычную нядобранадзейнасць. На шчасце, у 1913 годзе высылка з Прывісленскага краю паводле амністыі была скасаваная, і ён атрымаў дазвол аднавіць навучанне ў Нова-Александрыйскім інстытуце. Узнікла яшчэ адна магчымасць завяршыць сваю адукацыю.

* *Лібава-Роменская чыгунка адкрыта ў 1874 годзе, злучала Лібаву (цяпер Ліепая, Латвія) і Ромны (Сумская вобласць, Украіна), служыла найперш для перавозкі збожжа на экспарт. Праходзіла праз гарады Вільня, Менск, Гомель.*

СТАНАЎЛЕННЕ ГЕОГРАФА

Вяртанне ў Пулавы ✻ Эвакуацыя ✻ Першыя экспедыцыі ✻ Практыка на станцыі Энгельгарда ✻ У статыстычным бюро Менскага земства ✻ Перамены ў сямейным становішчы

Увосень 1913 года А. Смоліч вярнуўся ў Пулавы і пачаў грунтоўна займацца навукай: глебазнаўствам і сельскагаспадарчай геаграфіяй.

Улетку 1914 года пачалася Першая сусветная вайна. Фронт наблізіўся да Пулаваў, і Нова-Александрыйскі інстытут быў пераведзены ў глыбокі тыл, у Харкаў. З тых часоў інстытут так і застаўся ў Харкаве пад назовам Харкаўскага сельскагаспадарчага інстытута імя В. В. Дакучаева.

Зімой 1914/15 года Смоліча запрасілі да ўдзелу ў навуковай экспедыцыі па даследванні сялянскіх гаспадарак паўднёвых губерняў Расеі і Украіны. Узначальваў экспедыцыю інстытуцкі прафесар Аляксандр Чэлінцаў (1874—1962).

Прафесар А. Чэлінцаў быў адным з буйных спецыялістаў па арганізацыі гаспадаркі Расеі, асабліва глыбока цікавілі яго праблемы сельскагаспадарчага раянавання. Ён меркаваў, што для Расеі з яе велізарнымі прасторамі, рознымі кліматычнымі, глебавымі і эканамічнымі ўмовамі гэтая праблема мела надзвычай важнае значэнне. Паводле сваіх грамадска-палітычных поглядаў Чэлінцаў належаў да той ліберальнай расейскай інтэлігенцыі, якая лічыла галоўным сродкам паляпшэння становішча сялянства грамадскую агранамію і шырокае кааператванне сялянскіх гаспадарак*.

* *Ваништейн А. Л. Александр Николаевич Челинцев // Экономическая география СССР: История и современное развитие. М., 1965. С. 492—499.*

Разам з сваім настаўнікам Аркадзь Смоліч аб'ехаў увесь поўдзень Расеі і Украіны, сабраў каштоўны навуковы матэрыял, асвоіў метады яго апрацоўкі і аналізу. Погляды прафесара Чэлінцава зрабілі вялікі ўплыў на Смоліча. Ад гэтага часу ён назаўсёды захапіўся праблемамі арганізацыі сельскай гаспадаркі і сельскагаспадарчага раянавання. Менавіта гэтым пытанням вучоны прысвяціў шэраг сваіх пазнейшых працаў. Ад Чэлінцава навучыўся шырока выкарыстоўваць статыстычныя і геаграфічныя метады даследванняў, якія атрымалі ў яго далейшае развіццё. Адну з навуковых кніг А. Чэлінцава Смоліч адрэдагаваў і пераклаў у 1924 годзе на беларускую мову*.

У 1916 годзе тэарэтычны курс інстытута быў завершаны, і малады спецыяліст паехаў на практыку ў вёску Бацішчава**, дзе працаваў над тэмай, прысвечанай даследванню фізічна-хімічных уласцівасцяў падзолаў.

Вёска Бацішчава тады была адным з цэнтраў практычнай сельскагаспадарчай навукі. Тут дзейнічала сельскагаспадарчая станцыя, заснаваная вядомым прафесарам Аляксандрам Энгельгардам (1832—1893)***. У 1870 годзе ён быў арыштаваны за прапаганду ідэяў земскіх рэформаў і крытыку памешчыцкага землеўладання, потым высланы ў свой маёнтак Бацішчава, дзе стварыў узорную гаспадарку і школу для "інтэлігентных землеўласнікаў".

У Бацішчаве месцілася эталонная гаспадарка ўсёй нечарназёмнай зоны. Тут было чаму павучыцца, яго ўладальнік адзін з першых у Расеі пачаў выкарыстоўваць мінеральныя ўгнаенні, сыравінай для якіх былі адкрытыя ім у Рослаўскім павеце фасфарыты. У гаспадарцы разводзілі нарвежскіх коней, галяндскіх малочных кароў, оксфардскіх авечак і ёркшырскіх свіней. Гаспадарка вялася з размахам, на эўрапейскім роўні, яна прываблівала многіх, хто прысвяціў сябе агранаміі.

Увосень 1916 года Аркадзь Смоліч, які ўжо меў грунтоўную навуковую падрыхтоўку, свабодна валодаў украінскай, нямецкай і польскай мовамі, працягваў вывучаць ангельскую ды французскую, каб прадоўжыць збор матэрыялаў па геаграфіі Беларусі, паступае на працу ў Менскае губернскае земства — спачатку земскім статыстыкам, а потым намеснікам загадчыка статыстычнага бюро. Асабліва вялікае значэнне для Смоліча мела кіраўніцтва перапісам насельніцтва і гаспадаркі Менскай губерні ў 1917 годзе. У руках даследніка апынуўся каштоўны навуковы матэрыял, з якім можна было вяртацца ў Харкаў і развязваць тыя апошнія фармальнасці, што папярэднічалі атрыманню дыплома. Аднак рэвалюцыя, грамадзянская вайна і палітычная дзейнасць, у якую ўцягваецца Смоліч, прымусілі адкласці атрыманне дыплома яшчэ на некалькі гадоў. Тым часам адбыліся змены ў асабістым жыцці Аркадзя: ён ажаніўся з Аляксандрай Каткоўскай. Аляксандра была з сям'і чыгуначніка, які працаваў канторшчыкам на станцыі Бахмач Чарнігаўскай губерні. Яна атрымала "зборную" адукацыю: у 1912 годзе скончыла чатырохкласнае гарадское вучылішча ў Менску, у 1914 годзе завяршыла двухгадовыя педагагічныя курсы, а ў 1916—1917 гадах вучылася на прыродазнаўчым факультэце Маскоўскага народнага ўніверсітэта Шаняўскага. У прыватным універсітэце Шаняўскага вучылася шмат студэнтаў з беларускіх губерняў, якія потым зрабілі значны ўклад у беларускую культуру. Аляксандра Каткоўская ў 1919 годзе надрукавала буквар для беларускіх дзетак, які шмат разоў перавыдаваўся*.

---

* *А. М. Чэлінцаў. Рахункавы аналіз сельскай гаспадаркі. Менск, 1924.*

** *Вёска Бацішчава зараз у Сафонаўскім раёне Смаленскай вобласці.*

*** *Энгельгардаўская сельскагаспадарчая станцыя існуе і сёння, але размешчана ў іншым месцы — былым маёнтку А. Энгельгарда ў в. Стадолішча Пачынкаўскага раёна Смаленскай вобласці.*

* *Смоліч А. І. Зорка. Вільня, 1919.*

Пасля адной з першых сустрэч з будучым мужам Аляксандра пісала ў сваім дзённіку: "...у марах маіх было таксама, каб ён быў вышэйшы за мяне і па розуме, і па адукацыі, і па шырыні светапогляду. Каб ён быў просты, сціплы, шчыры і працавіты. Толькі сэрцы, я хацела б, каб былі ў нас роўныя".

У 1918 годзе ў маладой сям'і нарадзіўся першынец — сын Максім.

З МАРАЙ ПРА НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ

Сустрэчы з Максімам Багдановічам ✻ У гушчыні палітычнага жыцця ✻ Абвешчанне незалежнасці Беларусі ✻ Член першага беларускага ўрада ✻ Дыпламатычны прадстаўнік у Варшаве і Кіеве ✻ Аграном у Горадні

Пачатак XX стагоддзя адметны ў нашай гісторыі магутнай хваляй нацыянальнага адраджэння. Маладыя інтэлігенты, у якіх абудзілася нацыянальная самасвядомасць, імкнуліся абудзіць і іншых. Практычна ўсе першыя беларускія літаратары і навукоўцы не прайшлі па-за палітыкай, яны былі ў гушчыні грамадскага жыцця, у іх быў складаны лёс — эпоха сацыяльна-палітычных катаклізмаў і пераўтварэнняў наклала адбітак на іхныя біяграфіі. Аркадзь Смоліч, як і многія з яго пакалення, прайшоў праз перыпетыі гэтага бурлівага часу.

Пасля вяртання ў Менск Аркадзь не абмяжоўваўся толькі навукай і працай у земстве, ён збліжаецца з маладымі беларускімі паэтамі і аматарамі паэтычнай творчасці, з людзьмі, якія шанавалі беларускую культуру. Традыцыйным месцам іх сустрэч была "беларуская хатка" — невялікая драўляная хата, што стаяла на Захараўскай вуліцы недалёка ад Чырвонага касцёла. Тут месцілася сталоўка, якая ўвечары ператваралася ў літаратурны клуб*. Сюды разам з хлопцамі і дзяўчатамі суботнімі вечарамі прыходзілі Змітрок Бядуля і Ядвігін Ш., Уладзіслаў Галубок і Усевалад Фальскі. Паэты і празаікі чыталі

* *З 1991 года традыцыі "беларускай хаткі" адраджаюцца ў філіяле Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, вул. Рабкоравская, д. 14. Шэраг экспанатаў прысвечаны А. Смолічу.*

свае творы і ўсе разам спявалі песні. Самадзейным хорам звычайна кіраваў Аркадзь, ён жа з натхненнем дэкламаваў вершы ўлюбёных паэтаў Алеся Гаруна і Максіма Багдановіча.

Нарэшце ў другой палове верасня 1916 года ў Менск прыехаў і сам Багдановіч. На вакзале яго сустракаў Смоліч. Тут, у Менску, завязалася іх вялікае сяброўства. У абодвух маладых людзей былі агульныя інтарэсы, яны былі аднагодкамі, цікавіліся навінкамі паэзіі і літаратуры. Да таго ж Аркадзь таксама спрабаваў пісаць вершы і прозу. Разам з маладой паэткай Зоськай Верас* яны марылі пра стварэнне хрэстаматыі для беларускіх школ. Кніга павінна была складацца з чатырох частак і паказваць прыроду і побыт людзей роднага краю па порах года. М. Багдановіч браў на сябе складанне вершаў, А. Смоліч — гістарычна-геаграфічныя тэмы і пераклады з расейскай мовы, З. Верас — іншыя прыродазнаўчыя раздзелы і пераклады з польскай**. Але, на жаль, гэты праект ажыццявіць не ўдалося, Максім цяжка хварэў на сухоты, і сябры ўгаварылі яго ехаць лячыцца.

Пры канцы зімы 1917 года, за некалькі дзён да лютаўскай рэвалюцыі, Максім Багдановіч паехаў на лячэнне ў Ялту. Сябры і аматары беларускай мовы сабралі для яго патрэбную суму грошай, ён узяў іх толькі ў кошт ганарару за будучую кнігу. Смяротна хворы паэт не хацеў шумных праводзінаў — яго суправаджаў адзін Аркадзь. Ні з Смолічам, ні з роднай Беларусяй ён болей не сустрэўся, бо завяршыў свой кароткі жыццёвы шлях у Крыме.

Люты 1917 года скалыхнуў грамадскасць усёй велізарнай імперыі. Не засталіся ўбаку ад працэсаў дэмакратызацыі і беларускія губерні. Менск становіцца цэнтрам палітычнага жыцця Беларусі. 25—27 сакавіка 1917 года тут адбыўся Першы нацыянальны з'езд беларусаў. Ён быў нешматлікі — прысутнічала каля 150 удзельнікаў. Задачай з'езда была арганізацыя прапаганды сярод беларускага насельніцтва, найперш сялянства, ідэяў нацыянальнай аўтаноміі. Дзеля кіраўніцтва гэтай працай быў абраны Беларускі Нацыянальны Камітэт у складзе 18 чалавек, у іх ліку і Аркадзь Смоліч. З'езд звярнуўся да Часовага ўрада з прапановай надаць Беларусі аўтаномію ў складзе Расеі, але ўрад Керэнскага адмовіў у гэтым, спаслаўшыся на тое, што гэта будзе вырашаць Устаноўчы сход. Такім чынам, у нацыянальным пытанні ён фактычна пайшоў па шляху расейскага царызму.

Палітычныя падзеі ў Беларусі, як і паўсюль у краіне, імкліва нарасталі. 25 кастрычніка следам за бальшавіцкім пераваротам у Петраградзе ўлада ў Менску перайшла ў рукі Саветаў, а 26 лютага 1918 года ў Смаленску быў створаны Абласны Выканаўчы Камітэт Саветаў (Аблвыканкамзах) і Савет Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту.

Аркадзь Смоліч увесь час, што папярэднічаў кастрычніку 1917-га, не парываў сваіх сувязяў з Беларускай Сацыялістычнай Грамадой, працаваў рэдактарам друкаванага органа партыі газеты "Грамада". 14—25 кастрычніка 1917 года ён у якасці дэлегата ад Менска браў удзел у працы III з'езда Грамады, дзе выконваў абавязкі сакратара і быў абраны намеснікам старшыні Цэнтральнага камітэта партыі.

Беларуская Сацыялістычная Грамада і некаторыя іншыя палітычныя плыні Беларусі ў новых умовах звязвалі свае надзеі на атрыманне нацыянальнай аўтаноміі з савецкай уладай. Паводле пагаднення з цэнтральнымі органамі савецкай улады, яны асігнавалі 50 тысяч рублёў на арганізацыю Усебеларускага з'езда. 14 снежня 1917 года сход быў адкрыты (пазней яго пачалі называць Усебеларускім кангрэсам)*.

---

* *Зоська Верас — псеўданім Людвігі Савіцкай, па мужу — Войцік.*

** *Літаратура і мастацтва. 1967. 29 верас.*

* *Крыніца. 1989. № 1.*

На сход сабраліся 1872 дэлегаты ад усіх рэгіёнаў Беларусі, усіх грамадскіх і палітычных арганізацый, у тым ліку пасланцы губернскіх земстваў, органаў мясцовага самакіравання, прафесійных саюзаў і кааператыўных таварыстваў. Сход стаў вяршыняй усяго папярэдняга беларускага руху*. Але Аблвыканкамзах на чале з А. Мясніковым не хацеў дзяліць уладу ў Беларусі, тым больш што некаторыя дэлегаты з'езда абвінавачвалі бальшавікоў ва ўзурпацыі ўлады.

Уначы з 17 на 18 снежня ў залу паседжанняў уварвалася група ўзброеных людзей на чале з камендантам Менскага гарнізона Крывашэіным і імем Савета Народных Камісараў Заходняй вобласці запатрабавала роспуску з'езда.

Разгон з'езда стаўся пераломам у дачыненнях з савецкай уладай: левыя завагаліся, правыя сталі яе ворагамі, але бальшыня прыйшла да думкі, што вызваленне беларусаў — справа іх самых. Беларуская Сацыялістычная Грамада ў перыяд пасля Усебеларускага сходу адмовілася ад свайго праграмнага патрабавання аўтаноміі Беларусі ў межах дэмакратычнай Расеі і стала на шлях атрымання нацыянальнай незалежнасці.

Ужо ўвечары 18 снежня, адразу ж пасля разгрому сходу, у Менскім чыгуначным дэпо пад аховай рабочых для аператыўнага кіраўніцтва беларускім рухам была створаная Рада Усебеларускага сходу, а праз тры дні, 21 снежня, — Выканаўчы Камітэт Усебеларускага сходу, у склад апошняга ўвайшоў і Смоліч.

Палітычнае становішча ў Беларусі ў лютым 1918 года ўскладнілася інтэрвенцыяй кайзераўскай Германіі. Пры набліжэнні нямецкіх войскаў бальшавікі паспешліва пакінулі Менск, і Выканкам Усебеларускага сходу выйшаў з падполля. Некалькі дзён ён быў адзінай уладай у Менску.

* *Советская Белоруссия. 1991. 5 июня.*

21 лютага Выканкам абвясціў аб стварэнні Народнага Сакратарыята Беларусі. Рэальная ўлада ў акупаваным у той жа дзень горадзе належала немцам. Германія не спяшалася прызнаць паўнамоцтвы Народнага Сакратарыята. Больш за тое, немцы выселілі Народны Сакратарыят з памяшкання, якое ён займаў, і пад выглядам вайсковай здабычы забралі з касы 340 тысяч рублёў. Пасля гэтага Народны Сакратарыят пачаў збірацца на прыватных кватэрах, хоць перашкодаў немцы ў гэтым не чынілі.

Тым часам у Берасці ішла падрыхтоўка да мірных перамоваў Нямеччыны з бальшавіцкай Расеяй. Аднак прадстаўнікі Беларусі на іх не былі дапушчаныя. 3 сакавіка 1918 года мірная дамова была падпісаная. Тэрыторыя Беларусі дзялілася паміж Расеяй і Нямеччынай па лініі Дзвінск*—Свянцяны—Ліда—Пружаны. На захад ад дэмаркацыйнай лініі, паводле дамовы, лёс беларускага насельніцтва павінны былі вырашаць Нямеччына і Аўстра-Вугоршчына.

Народны Сакратарыят Беларусі быў адзінай сілай, якая спрабавала абараніць правы беларусаў жыць у адной дзяржаве. Ужо праз шэсць дзён, 9 сакавіка 1918 года, сабраўся Выканаўчы Камітэт Усебеларускага з'езда, які неадкладна абвясціў Беларускую Народную Рэспубліку. 18 сакавіка Рада Усебеларускага з'езда змяніла назоў і пачала называцца Радай Беларускай Народнай Рэспублікай. Аркадзь Смоліч, які ўваходзіў у склад Рады і быў старшынёй фракцыі Грамады, у лісце да Івана Луцкевіча, датаваным 9 сакавіка, пісаў: "Людзей наагул шмат, кіраўнікоў палітычных, добра сьвядомых няма". З ініцыятывы Смоліча ў Раду быў кааптаваны шэраг сяброў Віленскай Беларускай Рады, у іх ліку заснавальнікі нацыянальнага руху браты Іван і Антон Луцкевічы. 23 сакавіка яны прыехалі ў Менск і сталі ініцыятарамі абвяшчэння незалежнасці Бе-

* *Дзвінск — цяпер г. Даўгаўпілс у Латвіі.*

ларускай Народнай Рэспублікі. Гэтае пытанне было спачатку абмеркаванае на паседжанні фракцыі Грамады, а потым вынесена на сесію Рады.

24 сакавіка а 8-й гадзіне вечара сесія Рады Беларускай Народнай Рэспублікі была адкрытая, на ёй з асноўным дакладам пра становішча Беларусі і прычыны, якія вымагалі абвяшчэння незалежнасці БНР, выступіў дваццацішасцігадовы Аркадзь Смоліч. Ён адзначыў, што гэта быў правільны крок, закліканы выратаваць беларускі народ ад падзелу, які яму навязвалі. Спрэчкі па дакладзе працягваліся болей за дзесяць гадзін, і ў выніку 25 сакавіка была прынятая рэзалюцыя аб незалежнасці. Яе прыняцце Рада вітала шумнымі авацыямі і выклікамі: "Няхай жыве незалежная Беларуская Народная Рэспубліка!"*

Рэзалюцыя 25 сакавіка і наступная за ёй трэцяя Устаўная грамата абвясцілі Беларускую Народную Рэспубліку незалежнай дзяржавай у этнаграфічных межах пражывання беларусаў. Першы беларускі ўрад не меў ні сродкаў, ні арміі, каб бараніць свае межы, але гэта быў важны палітычны крок, праз які свет даведаўся, што ёсць такі народ беларусы і яны хочуць будаваць сваю дзяржаву.

Праз месяц, 25 красавіка 1918 года, некалькі прадстаўнікоў Рады паслалі тэлеграму нямецкаму кайзеру Вільгельму II, у якой выказвалі падзяку за вызваленне ад улады бальшавікоў. Гэтым яны спадзяваліся прыцягнуць увагу Нямеччыны да Беларускай Рэспублікі, знайсці ў яе падтрымку, атрымаць прызнанне, але бальшыня Рады не хацела супрацоўнічаць з акупантамі. Аркадзь Смоліч гэтай тэлеграмы не падпісваў.

Тэлеграма да Вільгельма II мела свой драматычны працяг, бо менавіта яна спрычынілася пазней да развалу Беларускай Сацыялістычнай Грамады і расколу Рады. Ужо ў 1918 годзе ўзнік шэраг новых

* *Советская Белоруссия. 1991. 6 июня.*

беларускіх партый, у іх ліку Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя. Паводле меркавання некаторых навукоўцаў, аўтарам яе праграмы быў А. Смоліч*. Погляды аўтара праграмы на аграрную рэформу сведчаць пра добрае веданне ім становішча ў сельскай гаспадарцы Беларусі і шляхоў яе развіцця, асноўным з якіх ёсць, на яго думку, шырокая кааперацыя. Тут мы пазнаем ідэі не толькі Аркадзя Смоліча, але і ягонага настаўніка Аляксандра Чэлінцава.

Ад верасня 1918 года Смоліч пачынае займацца выкладчыцкай дзейнасцю. Ён выкладае геаграфію на беларусазнаўчых і Беларускіх педагагічных курсах, адкрытых у Менску з ініцыятывы Камісіі асветы Рады БНР. Смолічы жылі небагата, а між тым сям'я расла — у 1919-м нарадзілася дачка Ганна. Курсы давалі дадатковы заробак і задавальнялі жаданне маладога выкладчыка дзяліцца з сваімі слухачамі ведамі, расплюшчвалі ім вочы на някідкую прыгажосць роднай прыроды.

Аднак асноўны час займала праца ва ўрадзе, Народным Сакратарыяце, а потым — у Радзе народных міністраў. Аркадзь Смоліч напачатку працуе тут народным сакратаром асветы, пазней — народным міністрам земляробства і віцэ-прэм'ерам. Разам з тым вядзе актыўную дыпламатычную дзейнасць. У снежні 1918 года ён паўнамоцны дэлегат у Кіеве. Дзейнасць Смоліча прыносіць свой плён, удаецца атрымаць пазыку ад урада Украінскай Народнай Рэспублікі. А неўзабаве яго чакала дыпламатычная паездка ў Берлін. Тут у 1919 годзе Смолічу ўдалося выдаць этнаграфічную карту Беларусі, у гэтым жа годзе такая карта выйшла і ў Вільні. У Нямеччыне Смоліч-дыпламат спрабуе дамагчыся прызнання нашай дзяржавы, але гэтыя спробы, на жаль, не мелі поспеху. Немцы засталіся абыякавымі да волевыяўлення беларусаў.

Пасля лістападаўскай рэвалюцыі 1918 года, якая

* *У. М. Казбярук. Светлай волі зычны звон. Мн., 1992.*

ўскалыхнула Нямеччыну, пачаўся вывад нямецкіх войскаў з Беларусі. Тым жа часам з усходу ў межы Беларускай Рэспублікі ўваходзілі часціны Чырвонай арміі. Урад БНР перабраўся ў Вільню, потым у Горадню, а яшчэ праз некалькі дзён была ўтвораная Савецкая Беларусь. Абвяшчэнне 1 студзеня 1919 года ў Смаленску Сацыялістычнай Савецкай Рэспубліки Беларусь* у значнай ступені было выклікана неабходнасцю стварыць альтэрнатыву Беларускай Народнай Рэспубліцы, але несумненна, што калі б не было БНР, якая абудзіла нацыянальную самасвядомасць у народзе, пытанне пра ўтварэнне ССРБ не было б развязанае так хутка, а можа, і ўвогуле не паўстала б.

Ад лютага Польшча, узброеная дзяржавамі Антанты, пачала акупацыю беларускіх земляў. Аркадзь Смоліч ва ўрадзе БНР быў тады адным з прыхільнікаў польскай арыентацыі, бо лічыў, што маладая польская краіна будзе толькі вітаць новую беларускую дзяржаву, альянс з якой зробіць яе больш незалежнай у супрацьстаянні паміж Нямеччынай і Расеяй. Жыццё паказала, што Смоліч памыляўся. Паслабленне Нямеччыны і Расеі, падтрымка Польшчы Англіяй і Францыяй прывялі да з'яўлення на заходніх рубяжах Беларусі новага драпежніка. Смоліч, які свабодна валодаў польскай мовай, вядзе перамовы ў Варшаве. У сталіцы Польшчы ён сустракаецца з самым Пілсудскім, але палякі, як раней і немцы, былі абыякавымі да патрэбаў беларусаў, іх мэта — падпарадкаванне беларускіх земляў, стварэнне Вялікай Польшчы.

Беспаспяховая палітычная дзейнасць пачынае надакучаць Смолічу. Палітыка, урэшце, замінае займацца навукай, а гэтым часам у яго асабліва шмат працы, ён рыхтуе да выдання сваю першую кнігу "Географія Беларусі". Пазней у прадмове да яе ён напіша: "Пісана ў такім часе, які найменш спрыяе

* *ССРБ — афіцыйны назоў Савецкай Беларусі да 1927 года.*

навуковай выдавецкай рабоце". У лісце да Б. Тарашкевіча з Варшавы, на жаль, недатаваным, А. Смоліч паведамляе, што цвёрда намерыўся пайсці з палітыкі: "Я, як ведаеш, з палітыкі выходжу і то ў днях найбліжэйшых..."

Заслуга многіх дзеячоў Беларускай Рады не толькі ў палітычнай абароне правоў беларусаў. Адным з важных бакоў дзейнасці Рады, яшчэ недастаткова апісаным гісторыкамі, была нацыянальная асвета, якая абуджала масы і спрыяла развіццю беларускай культуры.

Аркадзь Смоліч не перапыняў педагагічнай працы і ў гэты перыяд, насычаны актыўнай палітычнай дзейнасцю. У 1919 годзе ён выкладаў на Віленскіх курсах па падрыхтоўцы настаўнікаў для беларускіх школ. Пры канцы гэтага ж года, ужо адышоўшы ад палітыкі, ён пасяліўся ў Горадні, дзе займаўся арганізацыяй беларускіх школ і выкладаў геаграфію. Пад час знаходжання ў Горадні войскаў Чырвонай арміі працаваў у савецкіх установах, у губваенрэўкаме ў якасці агранома. Гэта было першае супрацоўніцтва Смоліча з савецкай уладай.

У 1921 годзе Заходняя Беларусь пасля Рыжскай мірнай дамовы апынулася пад уладай Польшчы. Апарат Гарадзенскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта быў эвакуяваны ў Віцебск. Смолічу з сям'ёй выехаць не ўдалося, бо захварэла на дызентэрыю дачка Ганна.

Праз нейкі час сям'я Смолічаў, каб быць бліжэй да цэнтра беларускага духоўнага жыцця, да сяброў і аднадумцаў, пераязджае ў Вільню.

І ЗНОЎ ГЕАГРАФІЯ...

Праца ў Вільні ✻ Першая кніга ✻ Каго лічыць беларусам? ✻ Вяртанне ў Менск ✻ Краявіды роднага краю ✻ Ад геаграфіі Бацькаўшчыны — да геаграфіі свету ✻ Прафесар універсітэта

У Вільні Аркадзь Смоліч працуе тэхнічным кіраўніком Беларускага Выдавецкага Таварыства (па выданні навучальных дапаможнікаў), выкладае геаграфію на педагагічных курсах, робіць пераклады падручнікаў па кааперацыі. Некаторы час ён займаў пасаду загадчыка інструктарскага аддзела Віленскага хаўрусу кааператараў, але быў вымушаны пакінуць гэтую працу з прычыны пераследу польскімі ўладамі.

Пад час жыцця і дзейнасці па-за межамі Савецкай Беларусі Смоліч актыўна супрацоўнічае з Наркамасветы БССР. У Беларусі тады пачыналася беларусізацыя. Праўда, яна не стала яшчэ дзяржаўнай палітыкай*, працякала стыхійна і была выклікана патрэбамі жыцця, але ўжо адчыняліся сотні беларускіх школ, узнікала вострая неабходнасць у выданні дапаможнікаў на беларускай мове. Яшчэ ў траўні 1921 года Навукова-літаратурная камісія прыняла пастанову: "Прасіць Барзова напісаць падручнік па геаграфіі Беларусі ў аб'ёме этнаграфіі Беларусі, паказанай у картах Карскага і Смоліча..."**

Аляксандр Барзоў (1874—1939), буйны расейскі вучоны-географ і метадыст, з невядомых прычынаў

* *Беларусізацыя афіцыйна пачалася ў 1923 годзе пасля XII з'езда РКП(б).*

** *Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, фонд 42, вопіс 1, № 91, аркуш 80.*

адмовіў у просьбе, што прымусіла Наркамасветы БССР звязацца з Смолічам і рэкамендаваць яму падрыхтаваць да перавыдання "Геаграфію Беларусі", выдадзеную ў 1919 годзе.

Першае выданне "Геаграфіі Беларусі" выйшла ў друкарні "Промень" у Вільні. Галоўная мэта, якая стаяла перад аўтарам падручніка, добра выкладзена ў прадмове: "...Каб тыя беларусы, што прачытаюць гэтую кнігу, зацікавіліся сваёй Бацькаўшчынаю, каб узяліся самі за глыбейшае навуковае пазнаньне яе ці асобных праяваў яе жыцьця, каб заахвоціліся шукаць і бачыць яе арыгінальнае харастваа". Першая кніга А. Смоліча стала галоўнай кнігай ягонага жыцця, ён ішоў да яе ўсе папярэднія гады, не пакідаў працы над ёй аж да самай смерці. Кніга вытрымала тры выданні: ў 1919, 1922, 1923 гадах яна выходзіла ў Вільні, у 1925 годзе ў Менску пабачыў свет падручнік пад назовам "Кароткі курс геаграфіі Беларусі". Ад выдання да выдання А.Смоліч удасканальваў сваю кнігу. "Кароткі курс..."зусім не кароткі. Гэта значна дапоўнены варыянт віленскіх выданняў, у ім больш за 350 старонак.

Ужо першае выданне кнігі "Геаграфія Беларусі" было заўважанае ў краіне, а другое, якое выйшла на замову Наркамасветы БССР, практычна цалкам распаўсюджвалася ў межах Савецкай Беларусі. Падручнік Аркадзя Смоліча трапіў таксама ў беларускія школы Украіны, Сібіры, Далёкага Усходу. У 20-х гадах ён атрымаў станоўчыя водгукі і рэцэнзіі. У часопісе "Асвета" за 1926 год адзначалася, што ў "Геаграфіі Беларусі" — "удалая сістэматызаванасьць і аб'яднаньне ўсіх матар'ялаў, якія былі да апошняга часу страшэнна расьцярушаныя па асобных працах розных дасьледчыкаў..." Газета "Звязда" за 8 сакавіка 1926 года адзначала кнігу як "лепшае кіраўніцтва, напісанае для вучняў нашай беларускай школы".

Беларусь у падручніку разглядалася ў этнаграфічных межах пражывання беларусаў, да кнігі была

прыкладзеная і этнаграфічная карта. Гэты факт выкарыстоўваўся пазней як падстава для абвінавачвання яе аўтара ў нацыяналізме. Але мы ўжо ведаем, што падручнік напісаны паводле замовы Наркамасветы БССР. Гэта было сацыяльна абумоўлена. У 20-х гадах урад Савецкай Беларусі праводзіў актыўную палітыку збірання беларускіх земляў вакол Менска. Паказ рэспублікі ў этнаграфічных межах мусіў садзейнічаць усталяванню адпаведных дзяржаўных межаў маладой Беларускай рэспублікі.

У "Кароткім курсе..." А. Смоліч пісаў: "З далейшым ростам і пашырэньнем самасьвядомасьці на Усходняй Беларусі, магчыма, паўстане пытаньне аб далучэньні новых яе частак, а можа, усяго краю да Беларускай С. С. Рэспублікі". Далей ён адзначыў, што "пашырэньне Беларускай ССР, якое адбылося ў 1924 годзе, перад усім сьветам паказала, што пытаньне аб дзяржаўных межах, якое буржуазія разьвязвае вайною, сацыялістычныя рэспублікі разьвязваюць згодным паразуменьнем, праз выяўленьне волі самых шырокіх мас работнікаў і сялян".

Усе мы памятаем з вядомага азначэння ў школьным курсе грамадазнаўства характэрныя рысы нацыі: гэта агульнасць тэрыторыі і эканамічнага жыцця, агульнасць мовы, нацыянальнага характару, культуры. У А. Смоліча галоўны крытэр нацыі — яе мова. З ім можна спрачацца, але на той час, калі нацыянальная самасвядомасць шырокіх масаў была даволі нізкая, калі каталікі нярэдка лічыліся палякамі, а праваслаўныя — расейцамі, нельга было знайсці больш важкі крытэр. Звернемся да Смоліча: "Важнейшай і найбольш пэўнай адзнакаю народу ёсьць яго мова... Беларус гаворыць па-беларуску, але лічыць сябе рускім... Тых, хто ў сябе ў хаце гаворыць па-беларуску, мы павінны лічыць за беларусаў, хаця б яны і ня ведалі сваёй нацыянальнасьці — іхная хатняя мова ёсьць довадам таго, што яны паходзяць ад беларусаў, гадаваліся і жылі сярод беларусаў, што культура, якая перахавалася ў беларускім ся-

лянстве, ёсьць для іх найбліжэйшая, свая... Беларуская мова ад Горадні і Беластоку і аж да Бранску — адна мова. Адны ў яе словы, бо яе стварыў адзін народ".

Першы падручнік па геаграфіі Беларусі, напісаны А. Смолічам, не мае нават і знаку сучасных яму казённых падручнікаў і статыстычных зводак. Беларусь для Смоліча — гэта не толькі край балотаў і лясоў, ягоная геаграфія — жывое апавяданне пра родны край, яго культуру і жыхароў, прыроду і гаспадарку.

Аркадзь Смоліч быў прыхільнікам краязнаўчага прынцыпу вывучэння геаграфіі, гэта значыць лічыў, што перадусім неабходна адплюшчыць вочы школьніку на родны край, на прыроду, гаспадарку і побыт насельніцтва сваёй мясцовасці, а потым пераходзіць да вывучэння краінаў свету. Ён пісаў: "Чалавек, аднак, пазнае далёкае і незнаёмае, раўняючы яго да блізкага і знаёмага. Затым жа нават той, хто цікавіцца толькі геаграфіяй чужых краёў, павінен уперад добра ведаць геаграфію найбліжэйшай мясцовасьці, павінен ведаць, далей, геаграфію свае роднае краіны, дзе ён радзіўся, вырас, працуе, дзе ляжаць косьці яго дзядоў, дзе жыць і працаваць будуць дзеці і ўнукі яго самаго, дзе жыве той народ, з якога ён паходзіць, адным словам — Геаграфію Бацькаўшчыны, ён ужо шмат лягчэй зразумее геаграфічныя зьявы якога хаця краю... Кожны ведае, што для нас, беларусаў, Бацькаўшчына ёсьць Беларусь, край, дзе мы самі жывём, дзе жыве той народ беларускі, да якога мы належым. Геаграфія Бацькаўшчыны для нас — гэта геаграфія Беларусі". На жаль, сёння ў школе ўсё наадварот — геаграфія свайго краю вывучаецца "зверху": ад свету — да краіны.

Амаль 80 гадоў прайшло з таго часу, як пабачыла свет першае выданне працы А. Смоліча, але і дагэтуль у нас няма лепшай кнігі па геаграфіі Беларусі.

Галоўнай асаблівасцю "Географіі Беларусі", якая

розніць яе і сучасныя падручнікі, ёсць выразнасць выкладу, сакавітасць мовы, велізарная ўвага, што аддаецца культуры і побыту беларусаў. За кожнай старонкай паўстае аўтар, улюбёны ў свой народ, у прыроду Бацькаўшчыны, чалавек, які верыць у светлую будучыню роднага краю: "Мерны, здаровы клімат, багацьце і буйнасьць жывое прыроды, разнароднасьць краявідаў і выключна шырокае разьвіцьцё шляхоў ствараюць у Беларусі вельмі спрыяльныя варункі для разьвіцьця народу".

Доктар геолага-мінералагічных навук Э. Ляўкоў у 1988 годзе пісаў пра падручнік Аркадзя Смоліча: "З гэтага часу нямала таленавітых даследнікаў працавала ў гэтай галіне, былі дасягненні ў вывучэнні азёр і рэк, клімату, рэльефу, тапанімікі і эканомікі, але да таго ўзроўню і метадалогіі геаграфія пасля забароны кніг Смоліча не паднялася, ніхто не адважыўся адзін напісаць настолькі цікавы для чытачоў рознага ўзроўню падручнік"*.

Географы 90-х гадоў гавораць пра новыя галіны сваёй навукі, пра сацыяльную геаграфію, этнагеаграфію, геаграфію культуры, але ўсё гэта мы знаходзім ужо ў Смоліча. Сучаснаму вучонаму ёсць чаму ў яго павучыцца.

Кніга А. Смоліча — культурнае багацце нашага народа. Яна павінна захавацца ў нашай памяці, як і творы класікаў мастацкага слова. Няхай кола чытачоў А. Смоліча будзе меншае, чым Уладзіміра Караткевіча ці Васіля Быкава, але сучаснае ўзнаўленне "Географіі Беларусі" можа стаць магутным сродкам уздыму разумовай культуры народа**. Кніга дапаможа чытачу ўбачыць прыродныя і культурныя краявіды Беларусі 20-х гадоў такімі, як іх бачыў сам аўтар.

Свет не стаіць на месцы. За дзесяцігоддзі, што прайшлі пасля выдання падручніка А. Смоліча, прырода нашага краю вельмі змянілася: балоты Палесся асушаныя і перасушаныя, па пакінутых вёсках Магілеўшчыны і Гомельшчыны вецер разносіць радыеактыўны пыл, на месцы былых старобінскіх лясоў — кар'еры і шламасховішчы салігорскіх калійных камбінатаў. Таму падручнік А. Смоліча — гістарычны дакумент вялікай важнасці, дакумент пра тое, што было і чаго ўжо няма.

У жніўні 1922 года Аркадзь Смоліч атрымаў дазвол урада БССР пераехаць на сталае жыхарства ў Савецкую Беларусь. Успомнім, што агульная амністыя для сяброў Рады Беларускай Народнай Рэспублікі была абвешчаная толькі ў 1923 годзе. Вяртанне Смоліча было не выпадковае, у Савецкай Беларусі ён бачыў сілу, здольную забяспечыць развіццё нацыянальнай культуры: ужо ў 1919 годзе ў лісце да паплечніка па змаганні за незалежнасць Антона Луцкевіча ён пісаў: "...мы нават будзем дапамагаць таму Савецкаму Беларускаму Ураду, які аб'яднае Беларусь і разаўець культурную працу і г.д."*

А. Смоліч быў не адзіным сябрам Рады, які паверыў бальшавікам. Па амністыі сюды пераехалі Я. Лёсік, С. Некрашэвіч, а пасля 1923 года — В. Ластоўскі, А. Цвікевіч ды іншыя. Нацыянальная палітыка беларусізацыі сталася галоўнай прычынай вяртання інтэлігенцыі і прыняцця ёю ідэі савецкай улады.

Аркадзь Смоліч прызначаецца ў Наркамат земляробства БССР аграномам-эканамістам, а затым кіраўніком планавага аддзела.

У цэнтральным беларускім друку з'яўляецца шэраг яго артыкулаў па зямельным пытанні, у іх аўтар абгрунтоўвае неабходнасць навуковага падыходу да земляробства. Тады ж выдаецца праца "Сельская гаспадарка ў БССР у 1921—1922 гг.", у якой не толькі аналізуецца становішча ў сельскай гаспадарцы, але і даюцца рэкамендацыі наконт яе далейшага

---

* *Звязда. 1988. 8 снеж.*

** *4-е выданне "Географіі Беларусі" зробленае Таварыствам беларускай мовы ў 1993 годзе накладам 10 000 паасобнікаў.*

---

* *Полымя. 1991. № 4. С. 213.*

развіцця. Смоліч арганізуе і праводзіць некалькі экспедыцыйных даследванняў асобных прыватных гаспадарак і першых калгасаў*, матэрыялы якіх ён выкарыстоўвае для працы "Арганізацыя сельскай гаспадаркі ў раёнах Цэнтральнай Беларусі". Гэтую працу А. Смоліч падае як дыпломную для завяршэння сваёй вышэйшай адукацыі, перапыненай у 1917 годзе. Такім чынам, ягоны шлях да дыплома заняў 15 гадоў — ад 1909 да 1924. Дыпломная праца была прызнаная выдатнай, рэкамендавана да друку і ў 1926 годзе надрукаваная.

Па-ранейшаму Аркадзь Смоліч займаецца педагагічнай і асветніцкай дзейнасцю. Адначасова з працай у Наркамземе ён выкладае на агульнаадукацыйных курсах Галоўнага ўпраўлення прафадукацыі, а ў лютым 1923 года падае заяву на працу ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. У красавіку паседжанне праўлення БДУ пастанавіла: "Залічыць Аркадзя Антонавіча Смоліча з 1 красавіка г.г. навуковым супрацоўнікам педагагічнага факультэта БДУ з ускладненьнем на яго абавязкаў тэрмінова прыступіць да арганізацыі пры БДУ кабінета па краязнаўстве".

Пасля стварэння кабінета краязнаўства, які, дарэчы, неўзабаве застаўся без памяшкання, у снежні 1923 года на паседжанні праўлення БДУ пад кіраўніцтвам рэктара прафесара У. Пічэты была прынятая пастанова: "Лічыць навуковага супрацоўніка А. А. Смоліча вартым званьня выкладчыка па кафедры геаграфіі Беларусі і Расеі".

У 1925 годзе на паседжанні рады педагагічнага факультэта А. Смоліч паспяхова абараніў сваю працу "Тыпы геаграфічных краявідаў Беларусі" і быў абраны дацэнтам па кафедры геаграфіі. Гэтая невя-

---

* *Калгасы, якія ўзніклі ў Беларусі ў 20-х гадах, былі добраахвотнымі аб'яднаннямі сялянаў, якія самі развязвалі асноўныя пытанні гаспадаркі, яны былі вельмі непадобныя на калгасы 30-х гадоў, утвораныя дзеля выцягвання падаткаў на патрэбы індустрыялізацыі.*



Аркадзь Смоліч, выпускнік агульнаадукацыйных курсаў Менскай духоўнай семінарыі. 1909 год



А.Смоліч, студэнт Нова-Александрыйскага інстытута сельскай гаспадаркі і лесагадоўлі. 1910 год




Духоўная семінарыя на Аляксандраўскай вуліцы. Месца вучобы А.Смоліча у 1905—1909 гадах




Будынак кіраўніцтва доследнай гаспадаркі Нова-Александрыйскага інстытута



Аляксандра Каткоўская, будучая жонка Аркадзя Смоліча. 1916 год



Ліст Аркадзя Смоліча да Зоські Верас, адасланы з Харкава ў лютым 1916 года



БЕЛАРУСКАЯ
СОЦЫЯЛЬ-ДЭМАКРАТЫЧНАЯ
ПАРТЫЯ,

ЯЕ МЭТЫ І ЗАДАНЬНІ.

Популярны выклад праграмы.

Мінск


Праграма Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі. Даследнікі мяркуюць, што аўтар яе — Аркадзь Смоліч (А.Ж.—ягоны крыптанім)



"Беларуская хатка". Рэканструкцыя Віктара Сташчанюка паводле апісання Зоські Верас



Першы ўрад (Народны Сакратарыят) Беларускай Народнай Рэспублікі: (злева направа, стаяць) Аркадзь Смоліч, Пётра Крэчэўскі, Кастусь Езавітаў, Антон Аўсянік, Лявон Заяц; (сядзяць) Алесь Бурбіс, Іван Серада, Язэп Варонка (старшыня), Васіль Захарка



Адміністрацыйна-палітычная карта Беларускай Народнай Рэспублікі, складзеная Аркадзем Смолічам. Выдадзеная на французскай мове ў 1919 годзе ў берлінскай друкарні Вільгельма Гартмана



Вокладка першага выдання славутай "Геаграфіі Беларусі" Аркадзя Смоліча (Вільня, 1919)




Менск. Высокае места (від з паўночнага боку, з-за Свіслачы). Ілюстрацыя Язэпа Драздовіча да "Географіі Беларусі"



Менск. Дом Кантаровіча. Тут, на 3-м паверсе (першая кватэра) ад 1919 да 1926 года жыла сям'я Смолічаў. Здымак 50-х гадоў



Будынак, у якім ад 1925 да 1928 года месціўся Інстытут Беларускае Культуры




Гэтае даследванне Аркадзя Смоліча займае выдатнае месца ў беларускай геаграфічнай навуцы як першая ландшафтазнаўчая праца



Аркадзь Смоліч пад час ссылкі ў горадзе Аса Уральскай (цяпер Пермскай) вобласці. Здымак 1931 года



Аркадзь Смоліч пад час ссылкі ў горадзе Ішым Омскай (цяпер Цюменскай) вобласці. Здымак сярэдзіны 30-х гадоў



РСФСР
Народный комиссариат по просвещению.
Челяб. обл. отд.
Ишимский Педагогический Техникумъ.
29 июня 1935 г.
№ 432
г. Ишим, ул. Республики №1

Копия

Справка
(для представления в РКИ)

Ишимский Педагогический техникумъ удостоверяет, что в трудовом списке преподавателя Смоличъ Аркадия Антоновича, хранящемся в делах техникума, о его занятиях до 1917 года значится следующее:
С февраля 1911 года по VII-1912 г. работал землемером-таксаторомъ в Ленском бюро при Минском обл. сельского х-ва. С V-1913 года по IX-1913 г. - лаборантомъ в химич. лаборатории Либаво-Роменской ж.д. и уволенъ по требованию жандармского управления за политическую неблагонадежность. С IX-1916 г. по X 1918 г. -

Копія адной з даведак, захаваных жонкай Аляксандрай з 30-х гадоў

лікая навуковая праца займае выдатнае месца ў беларускай геаграфіі, бо ёсць першай ландшафтазнаўчай працай у Беларусі.

У "Тыпах геаграфічных краявідаў Беларусі" вучоны дае сваё азначэнне ландшафту: "...гэта, уласьціва кажучы, геаграфічная характарыстыка раёна". За аснову вылучэння ландшафту бярэ генетычны прынцып: "Ландшафты Беларусі залежаць, галоўным чынам, ад геалагічнага мінулага". Пры вызначэнні тыпаў ландшафтаў ён карыстаецца перадусім метадам галоўнага ландшафтаўтваральнага фактара. Гэтакімі фактарамі на тэрыторыі Беларусі, паводле меркавання А. Смоліча, ёсць дзейнасць ледавіка і сучасныя эразійныя працэсы*. Такі падыход дазволіў вылучыць наступныя тыпы беларускіх ландшафтаў: 1) ландшафт канцавой марэны** (з дзвюма формамі — азёрнай і градавай); 2) ландшафт доннай марэны; 3) палескі ландшафт; 4) яравалагчынны (лёсавы)*** ландшафт лесастэпаў.

Да ўтварэння кожнага з вылучаных ландшафтаў спрычыніліся розныя фактары: двух першых тыпаў — дзейнасць ледавікоў, трэцяга — сукупнасць ледавіковай дзейнасці і эразійных працэсаў, чацвертага — толькі эразійныя працэсы. Такім чынам, край лясоў і балотаў з аднастайнай прыродай, якім ён бачыўся расейскім даследнікам, у А. Смоліча ператвараецца ў складаную мазаіку ландшафтаў.

Адметнасцю згаданай працы ёсць імкненне аўтара паказаць велізарную ролю чалавека ў пераўтварэнні ландшафту. Ён разглядае ўздзеянне чалавека

** Эрозія — працэс разбурэння горных пародаў і глебаў воднымі патокамі.*

*** Марэна — абломкавы матэрыял, перанесены або адкладзены ледавіком. Канцавая марэна — сістэма ўзгоркаў, што ўтвараецца на пярэднім краі ледавіка. Донная марэна — абломкавы матэрыял, што ўтвараецца на кантакце лёду з усцілкавай паверхняй, па якой рухаецца ледавік.*

**** Лёс — пылаватая горная парода светла-жоўтага ці палевага колеру, у яе складзе пераважаюць часцінкі дыяметрам 0,1—0,05 міліметра.*

не толькі на асобныя элементы, але і на ўвесь ландшафтны комплекс: "Аблічча Палесься зьмяняецца пад узьдзеяньнем чалавека". Разам з тым паказвае адваротны ўплыў зменены прыроды на грамадства: "У сувязі са зьнікненьнем лесу зьнікае і асноўная праца палешука, востра адчуваецца перанаселенасьць сёл і ў выніку — эміграцыя ў Сібір" або: "Побач з лясамі Беларусі знаходзіліся "паляны" — часткі стэпу, і на іх вельмі рана зьявілася земляробчае насельніцтва (60 чал/км^2), і з-за гэтай цеснаты яно вымушана займацца не толькі земляробствам, але і прамысловасьцю і нават эміграваць". У залежнасці ад тыпаў ландшафтаў, паводле Смоліча, адбываецца і рассяленне чалавека: "Сёлы, у асноўным, у далінах рэк з-за нізкага роўню грунтовых водаў" або: "вёскі на водаразьдзелах, уздоўж рачных далін, на высокіх месцах, дзе зямля больш дрэніраваная і сухая".

Акрамя таго, адзначаецца розная ступень уздзеяння чалавека на ландшафт у залежнасці ад прыродных умоваў. Так, у градавым канцова-марэнным ландшафце "глебы больш прадуктыўныя, земляробства больш старажытнае, чым у азёрным, і шчыльнасьць насельніцтва таксама большая (50 чал/км^2), і тут большы ўплыў чалавека..." Гэткай глыбіні характарыстык пазайздросціў бы кожны сучасны географ-ландшафтазнавец. А. Смоліча можна лічыць заснавальнікам не толькі ландшафтазнаўства ўвогуле, але і найбольш актуальнай цяпер яго галіны — антрапагеннага ландшафтазнаўства. Асабліва варта ўспомніць, што цікаўнасць да праблемаў антрапагенных ландшафтаў сучасных географаў узнікла толькі на пачатку 60-х гадоў. Калі б гэта здарылася раней, мы не адчувалі б сёння найскладанейшага экалагічнага крызісу, не ператварылі б сваю зямлю, як у Палессі, у антрапагенную пустыню з пясчанымі дзюнамі і высахлымі калодзежамі. Зусім інакш уяўляў сабе Аркадзь Смоліч будучыню таго ж Палесся, пра якое ён пісаў: "Палесьсе з яго рэдкім насельніцтвам і найменш выкарыстоўваемымі ў Беларусі прыроднымі багацьцямі з эканамічнага боку — край будучыні, засяленьне якога будзе ісьці за кошт імігрыцыі".

Разумеючы недакладнасць, абмежаванасць сваіх ведаў пра ландшафты, ён адзначаў: "Толькі ўзгодненая праца географаў, з аднаго боку, і беларусазнаўцаў іншых навук — з другога, і асабліва масавых краязнаўчых таварыстваў па ўсёй Беларусі, дае магчымасьць выявіць больш ці менш канкрэтны выгляд беларускай зямлі, складьці ўяўленьне аб ёй ня толькі на сваіх уражаньнях аб асобных ландшафтах, але і на аснове сінтэзу шырокіх дасьледваньняў усёй Беларусі. Такое ўспрыняцьце будзе, безумоўна, надзвычай карысным для геаграфічнай навукі і для іншых галін беларусазнаўства".

1925 год быў вельмі плённым для беларускага географа: разам з сваім бліжэйшым сябрам па ўніверсітэце Мікалаем Азбукіным* Смоліч выдае "Геаграфію пазаэўрапейскіх краёў", якая стала першым падручнікам па геаграфіі мацерыкоў на беларускай мове, выдадзеным беларускімі аўтарамі.

У снежні 1926 года на паседжанні дэканата педагагічнага факультэта ўніверсітэта рэктар У. Пічэта рэкамендаваў А. Смоліча на пасаду прафесара па кафедры геаграфіі. У сваёй рэкамендацыі ён адзначыў: "Дацэнт А. Смоліч працуе ва ўніверсітэце на працягу 4 год з вялікім посьпехам і, акрамя гэтага, мае цэлы шэраг прац геаграфічна-гістарычнага характару, якія высунулі дацэнта Смоліча як выдатнага дасьледніка па геаграфіі і эканоміцы Беларусі". 27 лютага 1927 года пастановай № 54 Народнага камісарыята асветы БССР Аркадзь Смоліч быў прызначаны на пасаду прафесара па кафедры геаграфіі з 1 студзеня 1927 года. На гэтай пасадзе ён заставаўся да 1 ліпеня 1930 года.

---

* *Пра Мікалая Азбукіна гл.: Беларускі ўніверсітэт. 1990. 26 крас.*

ПРАЦА Ў ІНБЕЛКУЛЬЦЕ І Ў АКАДЭМІІ

Ад супрацоўніка Тэрміналагічнай камісіі да сябра Інбелкульта ✻ Галоўны краязнаўца рэспублікі ✻ Чалавек, які не марнаваў часу ✻ Глеба — люстэрка ландшафту ✻ Заслужаная ўзнагарода

Гады працы А. Смоліча ў Менску непарыўна звязаныя з дзейнасцю Інстытута Беларускай Культуры, пераўтворанага ў 1929 годзе ў Беларускую Акадэмію Навук.

Першым зародкам навуковай працы ў БССР стала заснаваная ў 1921 годзе пры Акадэмічным цэнтры Наркама асветы Навукова-тэрміналагічная камісія пад старшынствам беларускага географа Міхайлы Грамыкі*, якая займалася апрацоўкай і выданнем навуковай тэрміналогіі і падручнікаў для сярэдняй і пачатковай школы. Браў удзел у працы камісіі і Аркадзь Смоліч, ён склаў два зборнікі тэрмінаў па батаніцы і сельскай гаспадарцы. На базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі на пачатку 1922 года быў утвораны Інстытут Беларускай Культуры (Інбелкульт) з мэтай "плянавага дасьледваньня Беларусі з боку яе мовы, літаратуры, этнаграфіі, гісторыі, прыроды, эканомікі, сацыяльна-грамадскага руху і інш., а таксама аб'яднаньня ў гэтых галінах усяе працы, якая вядзецца як навуковымі і мастацкімі ўстановамі, так і аддзельнымі асобамі"**, у складзе дзвюх секцый: гуманітарнай і прыродазнаўчай. У Інбелкульт як

* *Міхайла Грамыка больш вядомы як паэт і драматург, пра яго як географа гл.: Беларускі ўніверсітэт. 1990. 21 чэрв.*

** *Інстытут Беларускай Культуры. Менск, 1926.*

правадзейныя сябры ўвайшлі вядомыя дзеячы навукі і літаратуры: Сцяпан Некрашэвіч (старшыня), Янка Купала, Якуб Колас, Язэп Лёсік, Яўхім Карскі ды інш. Акрамя правадзейных сяброў у Інбелкульт уваходзілі сябры-супрацоўнікі, сярод іх прыяцелі Смоліча географы Міхайла Грамыка і Мікалай Азбукін. У 1923 годзе ў Інбелкульт быў запрошаны і Аркадзь Смоліч, яму даручылі стварыць аграномічную секцыю. Пазней Смоліч абіраецца яе старшынёй. Пад час працы ў Інстытуце Беларускай Культуры ў поўнай меры праявіўся арганізатарскі талент вучонага. У 1924 годзе пад яго кіраўніцтвам ствараецца Цэнтральнае бюро краязнаўства. Месца і ўплыў, якія займела краязнаўства ў грамадскім жыцці рэспублікі ў 20-х гадах, цяжка пераацаніць. Пры Цэнтральным бюро краязнаўства быў заснаваны музей прыроды, выдаваўся штомесячны часопіс "Наш край", праводзіліся рэспубліканскія краязнаўчыя з'езды. На першае кастрычніка 1926 года ў рэспубліцы было больш за 130 краязнаўчых гурткоў, якія аб'ядноўвалі 7000 сяброў, у асноўным настаўнікаў, студэнтаў, школьнікаў. Пра такі размах краязнаўчага руху сёння можна толькі марыць. У Цэнтральнае бюро краязнаўства, акрамя А. Смоліча, увайшлі рэктар універсітэта У.Пічэта, вучоны-аграрнік С.Скандракоў, гісторык В. Дружчыц, географ М. Азбукін і прадстаўнікі шэрагу дзяржаўных аб'яднанняў. Ужо ў сакавіку 1924 года прайшла нарада менскіх краязнаўцаў, дзе абмяркоўваліся праблемы краязнаўчага руху і шляхі далучэння да яго шырокіх масаў.

Патрэба ў стварэнні краязнаўчых арганізацый узнікла найперш з прычыны слабай вывучанасці тэрыторыі рэспублікі. Добра разумеючы становішча краязнаўства, А. Смоліч з уласцівым яму імпэтам неаднойчы даводзіў у сваіх выступленнях і допісах: "Краязнаўчая праца, аб'яднаючы вучонага дасьледніка і маладзенькага піянера-зьбіральніка калекцый, ёсьць адзінай пэўнай гарантыяй таго, што Беларусь перастане быць краем, невядомым для самых бела-

русаў, а ў выніку гэтага радыкальна зьменіцца аблічча ўсяе нашае гаспадаркі, усяе беларускае культуры"*.

Вялікую ролю ў развіцці краязнаўчага руху Смоліч адводзіў універсітэту: "...шмат залежыць ад універсітэту: калі б там разгарэлася вогнішча краяведнай працы, дык іскры ад яго, безумоўна, даляцелі б у глухія вясковыя школы, і геаграфія атрымала б там належнае ёй месца", і, вядома, школе: "...школа павінна выгадаваць сьвядомага грамадзяніна-краязнаўцу. Грамадзянства, узгадаванае ў краязнаўчай школе, будзе мець расчыненыя вочы на ўсё вакольнае жыцьцё, у яго руках будзе зброя найпатрэбнейшае навукі — навукі аб блізкім і знаёмым..."

У 1924 годзе з прычыны вялікай занятасці пасля рэарганізацыі Інбелкульта А. Смоліч мусіў пакінуць Цэнтральнае бюро краязнаўства. Але праца ў гэтай галіне пашыралася, і ён яшчэ не раз вяртаўся да яе праблемаў: удзельнічаў у першым Усебеларускім з'ездзе краязнаўцаў, напісаў шэраг артыкулаў у часопіс "Наш край", у якіх разгледзеў ролю краязнаўчых арганізацый у эканамічным раянаванні рэспублікі. Аркадзь Смоліч глыбока ўпэўнены, што "краязнаўцы ў гэтай справе могуць зрабіць шмат карыснай працы, выяўляючы і сістэматызуючы тое практычнае знаёмства з мясцовасьцю і мясцовымі ўмовамі, а таксама клапоцячыся аб найпаўнейшым выкарыстаньні ўжо праведзеных навуковых досьледаў і наяўнай навуковай літаратуры аб раёне, яны дапамогуць зрабіць раянаваньне і ўсё наагул новае будаўніцтва найбольш дасканалым пры сучасным стане ведаў аб краі". Раянаваннем Смоліч займаўся даўно і лепш за іншых бачыў карысць краязнаўчых арганізацый у гэтай справе. Ужо ў 1924 годзе як сакратар камісіі па раянаванні Дзяржплана БССР ён бярэ ўдзел у распрацоўцы праекта акруговага падзелу рэспублікі. За гэтую працу Смоліча

* *Савецкая Беларусь. 1924. 4 кастр.*

адзначаюць спецыяльнай пастановай Саўнаркама БССР, выносяць яму "рэвалюцыйную падзяку за праяўленую ў працы па раянаваньні вялікую энэргію, ініцыятыву і любоў да справы".

На жаль, краязнаўчы рух у Беларусі, як і наагул у Савецкім Саюзе, меў кароткае жыццё: ужо на пачатку 30-х гадоў пачаўся працэс яго згортвання. Хто можа адказаць, колькі краязнаўцаў трапіла ў турмы, лагеры і ссылку? Колькі іх не вярнулася адтуль? Сталінскаму рэжыму былі небяспечныя людзі, якія добра ведалі свой край, праўду пра жыццё яго людзей і да ўсяго мелі справу.

Праўда — смяротны вораг тыранічных рэжымаў. Краязнаўцаў, у іх ліку вядомых навукоўцаў (гісторыкаў, геаграфаў, мовазнаўцаў), а таксама вясковых настаўнікаў, захопленых імкненнем спазнаць родны край, сціплых супрацоўнікаў музеяў — усіх лепшых прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі першымі заганялі за калючы дрот. Усё нацыянальнае, самабытнае ўтойвалася, знікала, хавалася ў атмасферы абыякавасці, прыкрывалася за сумна вядомай шырмай інтэрнацыяналізму. Усе сродкі прапаганды і агітацыі настойліва рыхтавалі людзей абараняць не зняслаўленую Радзіму, а жыццё і недарэчныя ідэі новых багоў.

У 1925 годзе А. Смоліча прызначаюць правадзейным сябрам Інбелкульта і намеснікам яго старшыні. На працягу 1925—1928 гадоў ён быў галоўным рэдактарам выданняў Інстытута Беларускай Культуры, узначальваў выдавецтва, адначасова кіраваў сельскагаспадарчай секцыяй і камісіяй па раянаванні пры ёй. У 1928 годзе А. Смоліч разам з Усеваладам Ігнатоўскім, Вацлавам Ластоўскім і Сцяпанам Некрашэвічам распрацоўваў статут Беларускай Акадэміі Навук, утворанай 1 студзеня 1929 года. У шматлікіх артыкулах і кнігах Смоліча называюць акадэмікам, бо актыўныя ўдзельнікі Інстытута Беларускай Культуры атрымалі гэтую годнасць, але ён ім не быў, хоць у спісе асобаў, рэкамендаваных Інбел-

культам на атрыманне годнасці акадэміка, ягонае прозвішча значыцца. У наноў утворанай акадэміі Аркадзь Смоліч атрымаў пасаду загадчыка аддзела прыродазнаўства і гаспадаркі, кіраваў навукова-даследніцкай працай кафедры геаграфіі і падрыхтоўкай аспірантаў.

Яшчэ адзін кірунак дзейнасці прафесара Смоліча — публіцыстыка. Ён піша артыкулы аб працы Інбелкульта, пра краязнаўства, сельскую гаспадарку, становішча ў Заходняй Беларусі, пра пераследы, якія церпяць удзельнікі беларускага руху ў Польшчы. У ягоных артыкулах гучыць заклік не пакідаць жыхароў Заходняй Беларусі без шырокай падтрымкі працоўных усяго свету.

Дваццатыя гады былі настолькі запоўненыя справамі і падзеямі, што ўзнікае заканамернае пытанне: як ён паспяваў усё рабіць? Дзе знаходзіў час на ўсялякія справы? Адказ можна знайсці ва ўспамінах жонкі Аляксандры. У неапублікаваных мемуарах пад назовам "Кропелькі жыцця" яна піша: "За дваццаць гадоў супольнага жыцця я не памятаю такога выпадку, каб Аркадзь Антонавіч дарэмна марнаваў час. Ён не курыў, не піў, ніколі не займаўся ніякай пустой гутаркай, не цярпеў гультаёў, усялякіх пустазвонаў. Быў ён вельмі сціплы, уважлівы да людзей і надзвычай працавіты чалавек. Яго асабісты працоўны дзень звычайна зацягваўся да першай ці другой гадзіны ночы".

Сям'я Смолічаў жыла побач з сям'ёю Якуба Коласа, і народны паэт Беларусі доўгімі зімовымі вечарамі любіў бавіць час у сваіх суседзяў. Смолічы падтрымлівалі сяброўскія сувязі з сем'ямі Чарвякоўых, Ігнатоўскіх, Пічэтаў, Азбукіных, шмат якія святы адзначалі разам. У Смолічаў тады было ўжо трое дзяцей, апошняя дачка Марыя, якую ў сям'і ўсе звалі Мусяй, нарадзілася ў 1928 годзе. Паводле ўспамінаў Аляксандры Ігнатаўны, яны з мужам жылі вельмі дружна, не ўтойвалі нічога адзін ад аднаго, заўсёды дзяліліся ўсім перажытым, перадуманым, сваімі ма-

рамі, жаданнямі, сваёй працай: "Мы паважалі кожную думку, кожную дзейнасць аднаго ці другога. І заўсёды неяк выходзіла так, што між намі была самая цесная згода".

Гады працы Аркадзя Смоліча ў сталіцы Усходняй Беларусі сталіся часам бліскучага творчага ўздыму маладога вучонага — ён атрымаў прызнанне за межамі рэспублікі, вёў навуковую перапіску і дыскусіі з вядучымі географамі краіны, напісаў блізу 30 навуковых працаў. У 1926 годзе на агульным сходзе Расейскага геаграфічнага таварыства* пад старшынствам вядомага географа і акіянолага Ю. Шакальскага Аркадзь Смоліч быў абраны правадзейным сябрам.

А праз чатыры гады, 9 траўня 1930 года, на агульным гадавым сходзе Таварыства было абвешчана аб прысуджэнні беларускаму вучонаму па аддзяленні статыстыкі Малога залатога медаля. Пра значнасць той узнагароды для супольнасці географаў сведчыць такі факт: вядомы "дзядуля" расейскай геаграфіі Пётр Сямёнаў-Цян-Шанскі быў ганараваны ў сваім часе такой самай узнагародай за падарожжа і даследванне горнай сістэмы Сярэдняй Азіі.

Малы залаты медаль быў прысуджаны Аркадзю Смолічу за працу па сельскагаспадарчым раянаванні і дазіметрычную карту** Беларусі. У водгуку на працы ўзнагароджанага "Разьмяшчэньне насельніцтва БССР" (1929) і "Сельскагаспадарчыя раёны, папярэдняя схема і метадалагічныя ўвагі" (1930) старшыня аддзела статыстыкі Расейскага геаграфічнага таварыства М. Сямёнаў-Цян-Шанскі* пісаў:

** Расейскае геаграфічнае таварыства — адно з першых геаграфічных таварыстваў свету — было заснаванае ў 1845 годзе.*

*** Дазіметрычная карта (ад грэц. δασις — густы) — адзін з відаў картаў размяшчэння насельніцтва. Адрозна ад сучасных картаў шчыльнасці насельніцтва (па сутнасці картаграмаў) яна дэталёва паказвае, дзе жывуць людзі, а дзе мясцовасць незаселеная.*

"Абедзве кнігі праф. Смоліча павінны парадаваць кожнага сапраўднага географа, бо ў абедзвюх працах асновай эканамічнага даследвання Беларускага краю ёсць геаграфічныя прыкметы".

З шматлікіх элементаў, уласцівых геаграфічнаму ландшафту Беларусі, Смоліч выбраў глебы, ва ўтварэнні якіх бяруць удзел усе іншыя кампаненты ландшафту. Узяўшы за аснову глебы і паклаўшы на іх шматлікія эканамічныя прыкметы, перадусім шчыльнасць насельніцтва, беларускі прафесар атрымаў вельмі пераканаўчае геаграфічна-эканамічнае раянаванне Беларусі. А. Смоліч, такім чынам, прапанаваў іншым навукоўцам шлях, які ўводзіць эканамічную геаграфію ў кола геаграфічных навук.

Водгук М. Сямёнава-Цян-Шанскага вельмі важны для разумення даследванняў маладога навукоўца і ўсведамлення значэння ягонай працы ў далейшым развіцці геаграфічнай тэорыі аж да сучаснасці. Яшчэ ў 30—70-х гадах у геаграфіі назіраўся разрыў паміж дзвюма яе буйнымі галінамі — фізічнай і эканамічнай геаграфіяй. Географы баяліся змешваць прыродныя і грамадскія заканамернасці. Грамадства і прырода супрацьпастаўляліся адно аднаму, чалавек разглядаўся толькі як пераможца варожай яму дзікай прыроды, а апошняя — толькі як невычэрпная крыніца спажываных грамадствам рэсурсаў. Прафесар Смоліч у гэтым пытанні быў на вышыні. Антрапагенны ландшафт Беларусі для яго — вынік узаематворчасці чалавека і прыроды. Але і да гэтага часу ёсць яшчэ географы, якія адмаўляюць адзінства геаграфіі, яны не разумеюць, што свет адзіны і чалавек дадзены свету, каб падтрымліваць гармонію прыроды, што чалавек і прырода непадзельныя. І гэты велізарны свет павінна пазнаваць адзіная навука — геаграфія.

---

* *М. Сямёнаў-Цян-Шанскі — вядомы географ-статыстык, сын П. Сямёнава-Цян-Шанскага.*

24 чэрвеня 1930 года ў Белдзяржуніверсітэт прыйшоў ліст за подпісам Ю. Шакальскага: "Дзяржаўнае Расейскае Геаграфічнае таварыства вельмі рада, што змагло адзначыць працы А. Смоліча прысуджэннем яму названай ганаровай узнагароды". Перад Смолічам адкрываліся бліскучыя навуковыя перспектывы, але над краінай ужо згушчаліся чорныя хмары. Атрымаць свой залаты медаль Смоліч так і не паспеў...

БЛУКАННЕ ПА ПАКУТАХ

Разгром Акадэміі Навук ✻ Лісты на волю ✻ Навуковая праца ў следчым ізалятары ✻ Як кармілі ў Бутырскай турме ✻ Ішымскі мерыдыян ✻ Салодкае слова "свабода" ✻ Прыгоды ў Харкаве

Разгром Беларускай Акадэміі Навук пачынаўся бяскрыўдна, калі нішто не прадказвала жорсткай расправы. 15 студзеня 1929 года сход парт'ячэйкі акадэміі, у склад якой уваходзіў у асноўным яе дапаможны персанал, паставіў пытанне пра настроі і палітычныя погляды навуковых супрацоўнікаў. Пасля сходу пачаўся збор матэрыялаў, якія пацвярджалі "варожасць да савецкай улады" дзейнасці беларускіх вучоных. Парт'ячэйка вызначыла, што сярод навукоўцаў акадэміі 40% маюць сялянскае паходжанне, а 60% — з дваран ці мяшчанаў. Выявілася, што з сем'яў рабочых няма ніводнага вучонага. Больш за тое, членаў кампартыі ў акадэміі толькі 11,9%, але разам з тым 70,4% беларусаў, таму ўзнікае небяспека "сапраўды беларускага характару навуковай працы Беларускай Акадэміі Навук". Ячэйка ВКП(б) пачынае працу па ачыстцы шэрагаў акадэміі ад найбольш варожых элементаў, але яна насмельваецца падняць руку пакуль што толькі на ніжэйшы навуковы персанал. Кіраўніцтва акадэміі не звяртала ўвагі на "крытыку з месцаў". Жыццё навуковай установы ішло звычайным шляхам. Але ў ліпені 1929 года ў "Комсомольской правде" з'яўляецца артыкул "С камнем за пазухой" пра так званы "нацыяналістычны ўхіл" у асяроддзі беларускіх вучоных. Пачалося раскрыццё "шкоднай дзейнасці беларускіх нацыяналістаў": звальняюць з працы шэраг маладых навукоўцаў, ставіцца пытанне пра пазбаўленне навуковай годнасці аднаго з акадэмікаў. З крытыкай на адрас акадэміі пачалі выступаць на сваіх сходах работнікі заводаў і фабрык, навуковых установаў, часцей друкуюцца разгромныя артыкулы ў газетах*. Пры канцы чэрвеня — на пачатку ліпеня 1930 года вялікая група беларускіх вучоных была арыштаваная па справе міфічнай арганізацыі "Саюз вызвалення Беларусі". У іх ліку быў і А. Смоліч, яго арыштавалі 27 чэрвеня 1930 года.

Пра знаходжанне Аркадзя Смоліча ў Менскай следчай турме захаваліся неацэнныя дакументы — гэта кароценькія лісты і цыдулкі з турмы, якія клапатліва захавала жонка вучонага. Яна сабрала ўсю турэмную перапіску ў асобную тэчку. Шматлікія лісты і цыдулкі, напісаныя алоўкам, моцна пацерліся, і не ўсе словы на іх можна разабраць.

Не адчуваючы за сабой віны, Смоліч спадзяваўся на хуткае вызваленне і не падаў духам. У адной з першых цыдулак да жонкі ён пісаў: "Смоліч Алесі і ... здароў і весел. Ты ... Максіма адпраўляй... Прышлі грэбень. Атрымаў ручнік і мыла... Яды больш не трэба пасылаць. Хіба хлеба трохі... 28.07.30. Вітаю. Аркадзь".

Некаторыя лісты прымушаюць сумнявацца ў яго шчырасці, адчуваецца, што ён хоча трымацца бадзёра і, напэўна, перабольшвае свой дастатак за сценамі камеры. Дома таксама трэба нешта есці, дый сям'я не малая — трое дзяцей ды састарэлыя жончыныя бацькі, а ён адзіны кармілец. "Усё атрымаў, апроч гадзіньніка, а шкода. Яды не пасылай, бо псуецца. Кормяць нас часта і добра, кухар варыць вельмі смачна. Частку яды адсылаю назад, бо прападзе. Цукар у мяне тут ёсьць. Прышлі толькі верхнюю кашулю сінюю. Цалую вас крэпка ўсіх. Пішы больш. 5.07.30. Аркадзь".

Зрэшты, умовы ўтрымання ў савецкай турме па-

* *Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, фонд 3-с, № 259.*

чатку 30-х гадоў былі яшчэ не сама горшыя: дазваляліся сустрэчы з роднымі, перадачы з ежай і сподняй бялізнай. Жонка Аляксандра перадавала цэнтральныя і мясцовыя газеты, кнігі, а зрэдку нават і кветкі. Сталінскі рэжым яшчэ толькі адпрацоўваў страшную машыну знішчэння. А. Смоліч спрабуе заняцца навуковай працай, удасканаленнем у ангельскай і нямецкай мовах, робіць пераклады. У адным з лістоў ён падрабязна апісвае жыццё і заняткі ў турэмнай камеры: "Пытаецеся, як я жыву? Уяві сабе невялікі, сухі, сьветлы пакой — пад вечар і ў ім бывае некалькі гадзін сонца, — паветра досыць, крыху ёсьць сквазьняку, ад яго ў мяне, мусіць, плячо разбалелася, але цяпер я прыстасаваўся і наагул гэта прайшло. Чыстата залежыць ад мяне самаго, лазьня — вярней душ, бывае кожную дэкаду. Штодня шпацырую мінут дваццаць, стараюся за гэты час як больш прайсьці — гэта добра ўплывае на сон і наагул на пачуцьце. Спаў я раней шмат, цяпер, як кнігі ёсьць, сплю ў меру, а больш чытаю. Вочы ў мяне не баляць, ты ня бойся за іх. Увечары тут сьвету малавата, дык я не чытаю, шаную вочы.

За кнігі дзякую. Хацелася закончыць артыкул у Маскоўскі картаграфічны часапіс, ды ня ведаю, ці ўдасца сабраць літаратуру. У персьпектыве думаю заняцца перакладамі некаторых твораў Маркса. Ты паглядзі дзе-небудзь "К критике политической экономии", асабліва добра дастаць яе нямецкі арыгінал. Пазьней кніга гэта мне будзе патрэбна. Наагул займацца навукай тут можна, ніхто і нішто не перашкаджае, і часу хапае. Праца стварае зусім добры настрой і не агледзішся, як час бяжыць... 13.08.1930".

Артыкул у картаграфічны часопіс Смоліч усё ж напісаў. Праўда, гэтая навуковая праца пад назовам "Да метадалогіі абласных карт насельніцтва" так і засталася ў рукапісе. У артыкуле прафесар Смоліч вяртаецца да метадалогіі стварэння дазіметрычных картаў шчыльнасці насельніцтва. Як мы памятаем, дазіметрычная карта шчыльнасці насельніцтва была выдадзеная ў якасці дадатка да ягонай працы "Разьмяшчэньне насельніцтва БССР" (1929). Сёння толькі прафесійныя картографы могуць адказаць на пытанне, што ўяўляе сабой дазіметрычная карта. Каб зразумець сутнасць дазіметрычнага метаду пабудовы картаў, трэба нагадаць, як складаюцца сучасныя карты шчыльнасці насельніцтва. Яны адлюстроўваюць сярэднія паказнікі шчыльнасці для якога-небудзь раёна або краіны. Колькасць насельніцтва адміністрацыйнага раёна або іншай адзінкі дзеляць на яго плошчу. Атрыманыя паказнікі наносяцца на карту, якая загладжвае ўнутрыраённыя адрозненні. А яны могуць быць даволі вялікія, бо ў адным месцы буйныя паселішчы і вялікія масівы сельскагаспадарчых угоддзяў, а ў другім — лясы і балоты, гэта значыць практычна незаселеныя тэрыторыі. Карты шчыльнасці насельніцтва, зробленыя такім метадам, абсалютна не геаграфічныя, гэта, па сутнасці, картаграмы шчыльнасці насельніцтва. Аркадзь Смоліч лічыў, што дамагчыся геаграфічнасці картаў насельніцтва можна толькі ў тым разе, калі адысці ад адміністрацыйных межаў да межаў прыродных.

Дазіметрычны метад, развіты А. Смолічам, быў распрацаваны ў 1918 годзе В. Сямёнавым-Цян-Шанскім* пры стварэнні картаў размяшчэння насельніцтва паўднёвых частак Абанежжа і Прыладажжа. Сямёнаў-Цян-Шанскі складаў свае карты наступным чынам: спачатку акантурвалася паселішча на вызначанай адлегласці ад яго межаў, затым колькасць насельніцтва ў гэтым паселішчы дзялілася на плошчу атрыманага контура, дадзеныя наносіліся на карту, у выніку вызначаліся плямы згусткаў насельніцтва і тэрыторыі практычна без насельніцтва. Аркадзь Смоліч пайшоў далей, ён лічыў, што не вакол кожнага паселішча і нават не з усіх яго бакоў дапушчальна браць папярэдне вызначаную адлегласць

---

* *Веніямін Сямёнаў-Цян-Шанскі — выдатны расейскі географ, сын Пятра Сямёнава-Цян-Шанскага.*

дзеля акрэслівання контура дазіметрычнага арэала. За аснову пабудовы гэтага контура Смоліч узяў такія паказнікі, як размяшчэнне розных тыпаў глебы, расліннасці, а таксама шляхоў зносін.

Паводле ягонага меркавання, размяшчэнне глебаў "...найбольш моцна адбіваецца на распаўсюджаньні вясковага насельніцтва. Гэта адбываецца таму, што глеба, будучы вытворчай часткай усяго комплексу элементаў фізічна-геаграфічнага ландшафту, зьяўляецца адным з найбольш характэрных яго паказьнікаў, асабліва ў краінах раўнінных: з другога боку, яна складае непасрэдную базу земляробства і таму можа больш або менш спрыяць згушчэньню земляробчага насельніцтва". А. Смоліч даказаў, што найбольш інтэнсіўныя плямы гушчыні насельніцтва ляжаць на лёсавых і лёсападобных суглінках — сама ўрадлівых глебах рэспублікі, а найменей шчыльна населены раёны Палесся з пераўвільготненымі і балотнымі глебамі.

Аркадзь Смоліч адзначаў, што ўдакладнены ім дазіметрычны метад не павінны замыкацца толькі на картаграфаванні насельніцтва, а можа ўжывацца дзеля стварэння картаў урадлівасці, картаў транспарту і абмену. Галоўнае значэнне метаду, названага Смолічам метадам ізадазаў, або ізаліній, — у прыцягненні вялізнага статыстычнага матэрыялу, не запатрабаванага даследнікамі.

Праца прафесара Смоліча, напісаная ў сценах турэмнай камеры, — яшчэ адна вяршыня ягонай творчасці. Гэтай вяршыні і да цяперашняга часу не дасягнула не толькі беларуская геаграфія, але і ўся геаграфія былога СССР. Метад дазіметрыі даўно забыты географамі і картографамі. Зрэшты, на гэта былі і аб'ектыўныя прычыны: метад складаны, ён патрабуе велізарнай колькасці дакладнай статыстычнай інфармацыі і не можа грунтавацца на хлуслівай статыстыцы, з якой мы добра знаёмыя па яшчэ нядаўніх газетных публікацыях і рознага роду даведках.

Пастановай судовай калегіі ОГПУ БССР ад 10 красавіка 1931 года праз больш чым дзевяць месяцаў папярэдняга зняволення А. Смоліч быў засуджаны на пяць гадоў адміністрацыйнай ссылкі ў Уральскую вобласць. Яго апошняе пісьмо з Менскай следчай турмы датавана дваццатым траўня. З Менска А. Смоліча перавезлі ў маскоўскія Бутыркі, адкуль ён, атрымаўшы на тры дні паёк з 2025 грамаў хлеба, 680 грамаў селядца і 7,5 грама гарбаты, быў накіраваны да месца адбывання ссылкі ў горад Аса*. У Асе ён працаваў у мясцовым леспрамгасе, а потым уладкоўваўся планавіком-эканамістам у Асінскі райспажыўсаюз. У характарыстыцы, атрыманай у гэтай установе, адзначаецца, што ён праявіў высокую працаздольнасць і за кароткі тэрмін добра паставіў занядбаную планавую справу, прычым дамогся гэтых вынікаў "главным образом живым инструктажем, внимательно выправляя все шероховатости".

Неўзабаве ў Асу пераехала сям'я Аркадзя Смоліча, але ў гэтым маленькім гарадку не было нават сярэдняй школы, а дзяцей трэба было вучыць, і Смоліча з яго просьбы перавялі ў горад Ішым Омскай вобласці**. Па шляху ў Ішым Смолічам сустракаліся натоўпы жабракоў, змардаваных голадам людзей, цэлыя вёскі абязлюдзелі, а на дахах сельсаветаў развяваліся палотнішчы чырвоных сцягоў. У Заходняй Сібіры быў голад — першыя вынікі сталінскай калектывізацыі. Дзвесце гадоў, пачынаючы з часоў Пятра I, Сібір карміла сябе хлебам. Ды не толькі хлебам, але і маслам, яйкамі, а малако і мяса не вывозілі толькі таму, што не было халадзільнай тэхнікі. Балюча было бачыць гэта аграному, спецыялісту па сельскай гаспадарцы. Хіба пра такую кааперацыю марыў ён? Ён марыў пра добраахвотны хаўрус вольных вытворцаў, а "кааперацыя" пайшла

* *Аса — горад у сучаснай Пермскай вобласці.*
** *Цяпер горад Ішым у Цюменскай вобласці.*

па шляху гвалтоўнага прымусу і экспрапрыяцыі сялянскіх гаспадарак, ператварылася ў рэстаўрацыю прыгоннага стану, стала нябачаным адлучэннем вытворцы ад прыладаў і сродкаў ягонай працы. Ні аб якіх інтэлігентных землеўладальніках не магло быць і гутаркі, сялянства было задушанае голадам і галечай.

У Ішыме Аркадзь Смоліч працуе ў шэрагу арганізацый планавіком-эканамістам. Аднак нарэшце яму пашчасціла вярнуцца да педагагічнай дзейнасці. Ён уладкоўваецца ў Ішымскі жывёлагадоўчы тэхнікум, дзе выкладае арганізацыю буйной сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, тэхнічнае нармаванне, эканамічную геаграфію і батаніку. Але асноўнай ягонай працай у Ішыме было выкладанне ў мясцовым педагагічным тэхнікуме (цяпер — педагагічны інстытут). Тут Смоліч вёў курс фізічнай геаграфіі і методыку яе выкладання. Ішымскаму педагагічнаму тэхнікуму ён прысвяціў амаль пяць гадоў свайго жыцця.

У 1932 годзе ссыльны прафесар робіць спробу "пакаяцца" з надзеяй на вяртанне да свабоднага жыцця: ён падае прашэнне ў ЦВК СССР. А тым часам у Менску выйшаў зборнік артыкулаў "Навука" на службе нацдэмаўскай контррэвалюцыі" (1932), дзе Смоліч піша: "Контррэвалюцыйная па сутнасьці палітыка, якую мы праводзілі ў НК земляробства, спрыяла разьвіцьцю капіталістычных элементаў за кошт сацыялістычных і відавочна, што яна падрыхтоўвала для Беларусі шлях капіталістычнага разьвіцьця, і дзякуючы гэтаму ў персьпектыве — буржуазную дзяржаўнасьць, якую мы меркавалі ў выглядзе БНР". Цяжка зразумець, чым кіраваўся Смоліч, калі пісаў гэта. Магчыма, ён быў зламаны ў турэмных катоўнях, а можа быць, гэтае "прызнанне" напісана зусім не ягонай рукою?* А вось ліст на

** Па дадзеных прафесара В. Міхнюка, у гэтым зборніку змешчаны фальсіфікаваныя сведчанні А. Смоліча на адным з допытаў у Менскай турме.*

адрас ЦВК сапраўдны, копія яго захавалася ў сямейным архіве Смолічаў. У гэтым лісце А. Смоліч просіць зняць з яго ганебнае кляймо ворага народа, што дало б яму магчымасць быць у шэрагах найбольш адданых справе будаўнікоў сацыялізму. Але тады, у 1932 годзе, ён так і не дачакаўся літасці пралетарскага ўрада.

Адказу на свой ліст Смоліч так і не атрымаў і змушаны быў і надалей заставацца ў Ішыме, дзе працягваў працу ў педагагічным і медычным тэхнікумах, а таксама на рабфаку Омскага ветэрынарнага інстытута. Апрача таго, ад 1934 года ён вядзе курсы па падрыхтоўцы выкладчыкаў для няпоўных школ Омскай і Чалябінскай абласцей пры педтэхнікуме. Дзе б ні працаваў Аркадзь Смоліч, ён заўсёды атрымліваў толькі добрыя водгукі і падзякі, усе казалі пра яго надзвычайную працавітасць, памяркоўнасць у дачыненнях з людзьмі, захапленне працай. Памяць пра беларускага прафесара захавалася ў Ішыме дагэтуль. Ён, безумоўна, быў сама каларытнай фігурай сярод жыхароў гэтага невялікага сібірскага горада. Вось што напісала ў "Ишимской правде" за 29 жніўня 1989 года былая студэнтка Ішымскага педтэхнікума А. Янушэўская: "...Хоць прайшло болей за 50 гадоў, я добра памятаю Аркадзя Антонавіча Смоліча. Ён прыходзіў у кабінет геаграфіі толькі з журналам і ўказкай. Нас здзіўляла, чаму ў яго няма канспектаў, але ўсёведныя хлапчукі растлумачылі нам, што ён прафесар і па яго падручніках вучацца ў Беларусі... Тое, што ён нам даў, — усё засталося ў памяці да гэтага часу..."

2 жніўня 1935 года А. Смоліч атрымлівае нарэшце даведку аб вызваленні з ссылкі "без права проживания в Москве, Ленинграде, во всех столичных городах и погранполосе".

Свабода, хоць і абмежаваная, акрыляе вучонага, ён спрабуе звязацца з Харкаўскім сельскагаспадарчым інстытутам і Варонежскім універсітэтам, яму абяцаюць працаўладкаванне. Смоліч пасылае ліст

ва Ўсесаюзны камітэт па справах вышэйшай школы з просьбай вярнуць яму годнасць прафесара. Ён нецярпліва чакае адпачынку. Першы за пяць доўгіх гадоў адпачынак вольнага чалавека наперадзе, можна развязаць усе свае справы, вярнуцца да нармальнага чалавечага жыцця, да навукі. Усё нібыта складваецца як найлепш, у ліпені 1936 года "дзеля падтрымкі здароўя" яму выдзяляюць 500 рублёў. Зразумела, што грошы, і немалыя па тым часе, былі вельмі дарэчы.

У жніўні А. Смоліч наведаў Харкаў, але выявілася, што там ён непатрэбны... Бяда адна не ходзіць: на вакзале ў Харкаве Смоліч быў абрабаваны. Злодзей-кішэннік выцягнуў партманет з дакументамі і грашыма — нерастрачанай прэміяй. Не развязаўшы пытанне з працаўладкаваннем, нават не даехаўшы да Варонежа, без грошай, ён вяртаецца дадому, у Ішым. Але надзея не памірае, яшчэ не было адказу з Камісіі па справах вышэйшай школы, а таксама з Варонежскага ўніверсітэта. Астатнюю частку адпачынку Смоліч прысвячае навуковай працы. У навакольлі горада Ішыма ён праводзіць невялікае экспедыцыйнае даследванне і піша сваю апошнюю навуковую працу, якая так і засталася ў рукапісах: "Зона лиственных лесов и займищ на меридиане Ишима".

Увосень прыйшоў ліст з Варонежа — універсітэт не мае патрэбы ў яго паслугах, а на пачатку наступнага, 1937 года, ён атрымаў адказ з Масквы: "Переутверждению в профессорском звании не подлежите". Застаецца адно — працаваць і жыць у Ішыме, не той час, каб вяртаць згубленае — трэба захаваць тое, што ёсць, проста выжыць. На двары 1937 год, у краіне пачынаецца новая хваля сталінскіх "прызываў".

ЧАЛАВЕК ЗНІК?

Начны пратрус ✻ Вязень Омскай турмы ✻ Лісты да Крупскай, тэлеграмы да Вышынскага ✻ 10 гадоў без права перапіскі ✻ Безвыніковыя пошукі ✻ Пасведчанне Ішымскага загса ✻ Канчатковая рэабілітацыя

Уначы 18 чэрвеня 1937 года на кватэру выкладчыка педтэхнікума Аркадзя Смоліча прыйшлі рабіць пратрус. Гаспадар сядзеў за сталом, захінуўшы рукою патухлыя вочы, пакуль тры супрацоўнікі НКВД пратрэсвалі ўсе рэчы. Асаблівую цікавасць яны праявілі да кнігаў і рукапісаў ссыльнага прафесара, раз-пораз падносячы тое, што іх зацікавіла, начальніку райаддзела А. А. Бараўсаву. Скончылі толькі раніцай, склалі пратакол. У ім падрабязна апісалі ўсё канфіскаванае. У доўгім спісе было блізу двух дзесяткаў кніг, сярод іх трынаццаты том У. Леніна, двухтомнік М. Бухарына, 30 аркушаў навуковых працаў па геаграфіі, перапіска з О. Шмідтам, В. Сямёнавым-Цян-Шанскім ды іншымі вядомымі навукоўцамі. Загадалі збірацца з рэчамі...

Праз некалькі дзён пасля затрымання ў Ішыме Аркадзя Смоліча перавялі ў Омскую турму. Каб уявіць сабе апошнія месяцы яго жыцця, зноў звернемся да тэчкі з турэмнай перапіскай, сабранай жонкай Аляксандрай. Знаёмства з ёй дае магчымасць зрабіць выснову, што ўмовы ўтрымання ў турме ў 1937 годзе ўжо не тыя, што ў 30-м. Перадачы прымаліся толькі бялізнай, праўда, адзін раз — на Новы 1938 год дазволілі перадачу ежы. Ні кнігаў, ні газет, ні спатканняў з роднымі. Нават лісты з няволі сталі больш сухія, стрыманыя. Аркадзь пісаў алоўкам на другім баку жончыных цыдулак, таму мы можам ведаць усё, што пісалася і з волі, і з турмы.

"Смолічу Аркадзю Антонавічу! Перадаю: кашулю, прасціну, шкарпэткі, чаравікі. Ці патрэбная коўдра? Я здаровая, рыхтуюся да экзаменаў. Моцна цалую. Шура. 30.06.37".

А на другім баку ўжо ад Аркадзя: "Дарагая Шурачка! Пасылаю 10 штук бялізны. Здаровы і бадзёры. Перадачу атрымаў, прынясі трохі часныку, зубны парашок. Моцна цалую. Аркадзь".

Жонка Смоліча выкладала ў адной з Ішымскіх школ і адначасова вучылася завочна ў Омскім педагагічным інстытуце на біялагічным факультэце. Летнюю сесію за 3-ці курс яна здавала ўжо пасля арышту мужа, седзячы на лекцыях са слязьмі ў вачах. На пачатку новага навучальнага года яна была звольненая са школы як жонка ворага народа, а пасля выключана з інстытута, бо "не працуе настаўніцай у школе". Сям'я засталася без сродкаў да існавання. Гэта было замкнёнае кола, здавалася, выйсця няма. І тады Аляксандра Смоліч у стане адчаю і бяссілля намерваецца паслаць ліст да Н. Крупскай, у якім яна піша: "Вас, найбліжэйшую да Леніна, я лічу сябрам чалавецтва і таму насмелілася звярнуцца да Вас з гэтым лістом. Дапамажыце! Парайце, што рабіць? Чатыры месяцы таму арыштаваны чалавек, які, я ўпэўнена, не можа быць злачынцам у Савецкай краіне... Мне няма да каго болей звярнуцца, апрача Вас. У Савецкай краіне Смоліч мог прынесці шмат карысці, гэтакія людзі, як ён, патрэбны нашай Радзіме. Ён сумленны, разумны працаўнік, высокакваліфікаваны навуковец-географ..."

Заканчваецца ліст словамі поўнай бязвыхаднасці і разам з тым надзеі, якая ніколі не пакідае чалавека:

"Надзея Канстанцінаўна, калі Вы мне скажаце, што я не павінна працаваць у школе, заканчваць інстытут, тады я прыміруся з гэтым, а калі я маю права працаваць, вучыцца, дык дапамажыце мне, калі ласка, вярнуцца да вучобы і працы".

Неверагодна, але людзі больш верылі начальніку, высокапастаўленаму чыноўніку, чым самым сабе. Гэта страшна. Чалавек быў безабаронны перад крыважэрнай дзяржаўнай машынай, якая без усялякіх на тое падставаў магла абвінаваціць кожнага. І чалавек мусіў прымаць гэта як заслужаную кару, захоўваючы адданасць правадырам, іх тэорыям, дзяржаўнаму ладу.

Колькі лістоў з усіх краёў Саюза пісалася Крупскай — пісалі дзеці, настаўнікі, хатнія гаспадыні... Але дзіва адбылося. У студзені 1938 года Аляксандру Смоліч вызвалі ў аблана і сказалі: "Надзея Канстанцінаўна дакарае Вас за тое, што просіце за мужа". Праўда, адказу Крупскай ёй так і не паказалі, аднак ён усё ж падзейнічаў — Аляксандру Ігнатаўну аднавілі і на працы, і ў інстытуце.

10 чэрвеня 1938 года пастановай тройкі НКВД па Омскай вобласці Смолічу быў вынесены смяротны прысуд. Апошняя цыдулка, перададзеная ім з турмы, як заўсёды, пачыналася словамі "здаровы і бадзёры". Жонка нічога не ведала аб прыгаворы. Толькі 29 чэрвеня перададзеная мужу бялізна была вернутая ёй, а ў камендатуры сказалі, што Смоліч асуджаны на дзесяць гадоў без права перапіскі і ў турме яго няма — адпраўлены ў паўночныя лагеры. Праўда, грошы, здадзеныя на яго імя ў касу, былі прынятыя.

Што значаць слова "10 гадоў без права перапіскі", тады ніхто не ведаў, усе разумелі гэта літаральна. А можа, у гэта хацелася верыць...

Ад гэтага часу Аляксандра Смоліч пачынае шматгадовыя пошукі мужа, яна заводзіць другую тэчку, такую ж тоўстую, як і тая, што з турэмнай перапіскай. Тэчка прызначаная для скаргаў, заяваў, запытаў, афіцыйных даведак — усяго таго, што, паводле яе меркавання, магло выратаваць мужа. Сюды ж трапляюць і копіі лістоў, якія яна пісала, шукаючы роднага чалавека. Гэтых копіяў вельмі шмат — куды пісаць, было невядома. Сярод іх лісты старшыні НКВД Омскай вобласці, старшыні аддзела лагераў

сібірска-ўсходняй групы, у ГУЛаг НКВД у Маскве і г.д. Былі і тэлеграмы Генеральнаму пракурору РСФСР А. Вышынскаму: "Дазвольце да месца ссылкі ехаць сваім коштам". Старшыні УЦВК М. І. Калініну: "Паважаны Міхаіл Іванавіч, прашу змякчэння прысуду мужу, Смолічу Аркадзю Антонавічу".

І зноў: "Дазвольце да месца ссылкі ехаць сваім коштам". Гэта быў не 30-ты, ішоў 38-мы, адказаў не было.

Прайшло 10 гадоў невядомасці, бяссонных начэй і незаслужаных папрокаў... Аркадзь Антонавіч не вярнуўся, а лісты працягвалі шукаць яго па ўсёй Сібіры, па ўсёй краіне. Выраслі дзеці, усе атрымалі вышэйшую адукацыю, дый сама Аляксандра Ігнатаўна скончыла вучобу ў Омскім педагагічным інстытуце, стала выкладаць у ім. Аднаго разу хтосьці з студэнтаў сказаў ёй, што сустракаў прозвішча Смоліч дзесьці ў Нарыльску. Быццам бы нейкі Смоліч кіраваў там геалагічнай службай. Гэта было праўдападобна. Да прыкладу, Гаўрыла Гарэцкі, таксама беларускі географ, акадэмік, даўні сябар Смоліча, асуджаны першы раз яшчэ ў 1930 годзе, у месцах зняволення вымушаны быў пераквалiфікавацца, стаў кіраўніком геалагічных здымкаў трасы Беламорска-Балтыйскага канала. У Нарыльск, старшыні мясцовага НКВД, неадкладна паляцела чарговая папера. Але чутка пра Смоліча не пацвердзілася.

Дваццаць гадоў сям'я Смолічаў насіла ганебнае кляймо сям'і "ворага народа", амаль столькі ж гадоў нічога не было вядома пра нашага земляка. Толькі ў 1957 годзе з Цюмені паведамілі: "Справа па абвінавачанні Смоліча Аркадзя Антонавіча, 1891 года нараджэння, разгледжаная Прэзідыумам Цюменскага абласнога суда 9 лютага 1957 года. Рашэнне тройкі НКВД па Омскай вобласці за 10 чэрвеня 1938 года скасаванае і справаводства спыненае". Яшчэ праз месяц Ішымскім загсам было выдадзена пасведчанне пра тое, што "Смоліч Аркадзь Антонавіч памёр 17 сакавіка 1943 года", у даведцы было пазначана,

што прычынай смерці ў месцах зняволення быў міякардыт. Гуманны ўрад "клапаціўся" пра родных незаконна рэпрэсаваных. Сям'я атрымала права на грашовую кампенсацыю за 20 гадоў чакання мужа і бацькі ў памеры двух месячных акладаў з яго апошняга месца працы.

60—70-я гады да гэтых дзвюх кароткіх даведак не дадалі ніякай новай інфармацыі. Па сутнасці, нічога не змянілася: кнігі Смоліча ляжалі ў спецсховах, пісаць пра яго забаранялася, а ў Беларусі ён так і заставаўся "ворагам народа". Зрэдку, праўда, у навуковых геаграфічных працах успаміналі, што "География Беларусі" — "неудачное научно-методическое пособие", і гэтая трактоўка пераходзіла ад аднаго аўтара да другога, якія, пэўна, і кнігі не чыталі, бо не было дзе яе дастаць.

У 70-х гадах памерла Аляксандра Ігнатаўна. Памёр і першынец Аркадзя Смоліча, так і не даведаўшыся праўды пра свайго бацьку.

Толькі ў 1988 годзе на запыт Васіля Быкава "справа па абвінавачанні Смоліча А. А. перагледжана судовай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. Пастанова калегіі ОГПУ БССР за 10 красавіка 1931 года ў дачыненні да Смоліча А. А. скасаваная і справаводства спыненае дзеля адсутнасці ў яго дзеяннях складу злачынства".

Спатрэбілася 57 гадоў, каб зразумець, што ён, А. Смоліч, не вінаваты.

З часам высветлілася таксама, што даведка з Ішымскага загса — хлусня, а дата смерці ў месцах зняволення ад міякардыту прыдуманая. У 1991 годзе на запыт Геаграфічнага таварыства БССР ад Упраўлення КГБ па Омскай вобласці быў атрыманы адказ, што А. Смоліч расстраляны 17 чэрвеня 1938 года ў Омскай турме, а месца яго пахавання невядомае.

Месца пахавання невядомае... Але вядомае месца нараджэння Аркадзя Антонавіча. Тут, у вёсцы Бацэвічы Клічаўскага раёна, у верасні 1991 года

ў гонар стогадовага юбілею беларускага географа ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

На дошцы, прымацаванай на будынку мясцовай школы, напісана: "У вёсцы Бацэвічы нарадзіўся вядомы географ, першы беларускі прафесар геаграфіі Смоліч Аркадзь Антонавіч. 29(17).IX.1891 — 17.VI.1938".

ЗАМЕСТ ЗАКАНЧЭННЯ

Вядомы нямецкі географ Аляксандр Гумбальдт аднойчы сказаў: "Маю біяграфію шукайце ў маіх працах". Гэтае выказванне стасуецца з дзейнасцю кожнага вучонага. Бо сапраўднае жыццё навукоўца — гэта праца. Але Гумбальдту было лягчэй, ён пражыў дзевяноста гадоў, напісаў сотні навуковых працаў. Аркадзю Смолічу пашанцавала значна меней — ён знік на астравах ГУЛага ў сорак сем гадоў. Ён паспеў папрацаваць на ніве беларускай геаграфіі толькі блізу дзесяці гадоў, але змог сабраць залатое калоссе, нягледзячы на тое што бальшыня пасеянага дала свой плён пазней і не ён, на дзесяцігоддзі забыты ўсімі, збіраў гэты багаты ўраджай. Што зробіш, зерне прарастае не адразу.

Але думка Гумбальдта адпавядае і нашаму герою, яго навуковыя працы вяртаюцца са спецсховаў, абуджаюць вялікую цікавасць этнографаў, гісторыкаў, географаў — усіх, хто пакліканы спазнаць родны край. Праз дзесяцігоддзі Смоліча пачынаюць цытаваць, яго прозвішча сустракаецца на старонках газет і часопісаў.

Творчасць вядомага вучонага-географа яшчэ чакае грунтоўнага навуковага аналізу. Але ўжо сёння бачна — ён першы стаяў ля вытокаў геаграфіі Бацькаўшчыны, распачаў справу так, як і патрэбна было пачаць. Шырока адзначанае беларускай грамадскасцю 100-годдзе з дня нараджэння прафесара Смоліча ў верасні 1991 года паказала, што ён вярнуўся ў нашую гісторыю, вярнуўся, каб застацца ў ёй назаўсёды.

Жыццё вучонага працягваецца, такія людзі не паміраюць пасля фізічнай смерці, яны жывуць у нашай памяці, у памяці нашчадкаў, іх кнігі хвалююць нас, абуджаюць думку і клічуць дзейнічаць.

ЗМЕСТ

ПРАДМОВА 5

ПОШУКІ ЖЫЦЦЁВАГА ШЛЯХУ 7

Звесткі з метрычнай кнігі • На бацькавай сцежцы • З духоўнай семінарыі — у Кіеўскую палітэхніку • Інстытут у Пулавах. Жыццё студэнта • Далучэнне да Грамады • Сядзенне ў Саламерычах • Нялёгкі шлях у навуку

СТАНАЎЛЕННЕ ГЕОГРАФА 13

Вяртанне ў Пулавы • Эвакуацыя • Першыя экспедыцыі • Практыка на станцыі Энгельгарда • У статыстычным бюро Менскага земства • Перамены ў сямейным становішчы

З МАРАЙ ПРА НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ 17

Сустрэчы з Максімам Багдановічам • У гушчыні палітычнага жыцця • Абвешчанне незалежнасці Беларусі • Член першага беларускага ўрада • Дыпламатычны прадстаўнік у Варшаве і Кіеве • Аграном у Горадні

І ЗНОЎ ГЕАГРАФІЯ... 26

Праца ў Вільні • Першая кніга • Каго лічыць беларусам? • Вяртанне ў Менск • Краявіды роднага краю • Ад геаграфіі Бацькаўшчыны — да геаграфіі свету • Прафесар універсітэта

ПРАЦА Ў ІНБЕЛКУЛЬЦЕ І Ў АКАДЭМІІ 36

Ад супрацоўніка Тэрміналагічнай камісіі да сябра Інбелкульта • Галоўны краязнаўца рэспублікі • Чалавек, які не марнаваў часу • Глеба — люстэрка ландшафту • Заслужаная ўзнагарода

БЛУКАННЕ ПА ПАКУТАХ 44

Разгром Акадэміі Навук • Лісты на волю • Навуковая праца ў следчым ізалятары • Як кармілі ў Бутырскай турме • Ішымскі мерыдыян • Салодкае слова "свабода" • Прыгоды ў Харкаве

ЧАЛАВЕК ЗНІК? 53

Начны пераўрус • Вязень Омскай турмы • Лісты да Крупскай, тэлеграмы да Вышынскага • 10 гадоў без права перапіскі • Безвыніковыя пошукі • Пасведчанне Ішымскага загса • Канчатковая рэабілітацыя

ЗАМЕСТ ЗАКАНЧЭННЯ 59

НАШЫ СЛАВУТЫЯ ЗЕМЛЯКІ
Серыя акадэмічная

Навукова-папулярнае выданне

Болатаў Андрэй, Рыдзеўскі Генадзь

АХВЯРУЮЧЫ СЯБЕ БАЦЬКАЎШЧЫНЕ

АРКАДЗЬ СМОЛІЧ

Рэдактары *Яніна Марціновіч, Алесь Зьмітровіч*
Карэктар *Ірына Юхневіч*
Набор *Алена Лобач*
Макетаванне *Наталя Санько*
Мастацкае афармленне *Віталь Катовіч*

Падпісана ў друк 12.04.99. Фармат 84×100 $^{1}/_{32}$. Папера афсетная. Гарнітура літаратурная. Афсетны друк. Ум.-друк. арк. 3,12+0,78 укл. на крэйд. паперы. Ул.-выд. арк. 3,9. Наклад 1000 паасобнікаў. Замова № 221.

Выдавецтва "Тэхналогія". ЛВ № 73 ад 12.11.97. 220007, Мінск, вул. Магілеўская, 43. Баранавіцкая ўзбуйненая друкарня. 225320. Баранавічы, вул. Савецкая, 80.

КНІГІ СЕРЫІ "НАШЫ СЛАВУТЫЯ ЗЕМЛЯКІ"

Выйшлі з друку ў 1988–1999 гг.

Грыбкоўскі В., Гапоненка В., Кісялёў У. **Прафесар электраграфіі і магнетызму**
Пра Якуба Наркевіча-Ёдку (1847–1905), адкрывальніка электраграфіі і бяздротавай перадачы электрычных сігналаў

Мархель У. **Вяшчун славы і волі**
Пра Уладзіслава Сыракомлю (1823–1862), выдатнага паэта-дэмакрата

Галакціёнаў С., Яцкевіч Г. **Рыцар навукі з Нянькава**
Пра Уладзіслава Дыбоўскага (1838–1910), таленавітага даследніка прыроды і фальклярыста

Арлоў У. **Асветніца з роду Усяслава**
Пра Еўфрасінню Полацкую (~ 1110–1173), беларускую асветніцу і рэлігійную дзяячку

Юхо Я. **За вольнасць нашу і вашу**
Пра Андрэя Тадэвуша Касцюшку (1746–1817), кіраўніка паўстання супраць маскоўскага панавання

Грыцкевіч В. **Адысея навагрудскай лекаркі**
Пра Саламею Русецкую, знакамітую лекарку і падарожніцу XVIII стагоддзя

Процька Т. **Эксперыментатар з Беластоцкай гімназіі**
Пра Кароля Чаховіча (1832–1902), таленавітага вучонага-фізіка

Казбярук У. **Светлай волі зычны звон**
Пра Алеся Гаруна (1887–1920), выдатнага паэта, змагара за незалежнасць Беларусі

Тарасаў С. **Чарадзей сёмага веку Траяна**
Пра Усяслава Чарадзея (1044–1101), аднаго з найславуцейшых полацкіх князёў

Гусак А. **Практычная механіка і "Мёртвыя душы"**
Пра Мікалая Ястрэбскага (1808–1874), вучонага-інжынера, таленавітага літаратара

Саверчанка І. **Канцлер Вялікага Княства**
Пра Лева Сапегу (1557–1633), славутага палітычнага дзеяча, рэдактара Статута 1588 года

Бельскі А., Ткачоў М. **Вялікае мастацтва артылерыі**
Пра Казіміра Семяновіча (~ 1600–1651), вынаходніка шматступеневай ракеты

Сагановіч Г. **Айчыну сваю баронячы**
Пра Кастуся Астрожскага (1460–1530), славутага гетмана

Арлоў У. **Прысуд выканаў невядомы**
Пра Ігната Грынявіцкага (1856–1881), рэвалюцыянера-народавольца

Каханоўскі Г., Каханоўскі А. **Руплівец нашай старасветчыны**
Пра Яўстаха Тышкевіча (1814–1873), заснавальніка беларускага краязнаўства

Дабравольскі В. **Да ісціны – найпрасцейшым шляхам**
Пра Васіля Ермакова (1845–1922), таленавітага вучонага-матэматыка

Гапоненка В. **У пошуках гармоніі Сусвету**
Пра Івана Яркоўскага (1844–1902), таленавітага вучонага-фізіка

Юхо Я., Емяльянчык У. **"Нарадзіўся я ліцьвінам..."**
Перапрацаванае і дапоўненае выданне пра А. Т. Касцюшку

Процька Т. **Даследчык таямніцаў святла**
Пра Аляксандра Садоўскага (1859–1923), таленавітага вучонага-фізіка

Саверчанка І. **Апостал яднання і веры**
Пра Язэпа Руцкага (1574–1637), выдатнага пісьменніка, педагога і рэлігійнага дзеяча

Янушкевіч Я. **Неадменны сакратар Адраджэння**
Пра Вацлава Ластоўскага (1883–1938), выдатнага палітычнага і культурнага дзеяча

Ярмоленка В. **За даляглядам Айкумены**
Пра Івана Чэрскага (1845–1892), славутага географа і падарожніка

Гапоненка В., Кіштымаў А. **Уладар гранічнага холаду**
Пра Жыгімонта Урублеўскага (1845–1888), таленавітага вучонага-фізіка

Процька Т. **Пакутнік за веру і Бацькаўшчыну**
Пра Мітрапаліта Мельхісэдэка (1876–1931), прыхільніка незалежнасці нашае праваслаўнае царквы

Чарняўскі М. **Правадыр крылатых вершнікаў**
Пра Яна Кароля Хадкевіча (1560–1621), славутага гетмана

Болатаў А., Рыдзеўскі Г. **Ахвяруючы сябе Бацькаўшчыне**
Пра Аркадзя Смоліча (1891–1938), знакамітага вучонага-географа і нацыянальнага дзеяча

НАШЫ СЛАВУТЫЯ ЗЕМЛЯКІ

З духоўнай семінарыі — у Кіеўскую палітэхніку

Інстытут у Пулаве

Далучэнне да Грамады

Першыя экспедыцыі

Практыка на станцыі Энгельгарда

З марай пра незалежнасць

У гушчыні палітычнага жыцця

Міністр першага беларускага ўрада

Ад геаграфіі Бацькаўшчыны — да геаграфіі свету

Праца ў Інбелкульце і ў Акадэміі

Галоўны краязнаўца рэспублікі

Глеба — люстэрка ландшафту

Навуковая праца ў следчым ізалятары

Ішымскі мерыдыян

Вязень Омскай турмы

10 гадоў без права перапіскі

ISBN 985-6234-55-7

9 789856 234555